ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 114 (4366)
ПАНЯДЗЕЛАК, 23 мая 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

З 22 МАЯ ПЯЦІДЗЕНЬНІК ШТУРМУ НА ФРОНЦЕ ПАСЕЎНАЙ

УСІМ РАЙКОМАМ І ГАРКОМАМ КП(б)Б

У мэтах забесьпячэньня сваячасовага выкананьня масавай веснавой сяўбы ЦК пастанавіў абвясьціць з 22 мая пяцідзеньнік штурму ліквідацыі прарываў ў выкананьні плянаў сяўбы. Партарганізацыі павінны забясьпечыць у гэты тэрмін падцяганьне адстаючых у сяўбе калгасаў, саўгасаў, МТС, аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў, арганізуючы прэміяваньне скончыўшых датэрмінова сяўбу, пасылаючы буксірныя брыгады ў адстаючыя месцы. Пяцідзеньнік суправадзіць самай шырокай растлумачальнай масавай работай усёй партарганізацыі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Аб парадку правядзеньня гандлю калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобных сялян і памяншэньні падатку на гандаль сельска-гаспадарчымі прадуктамі

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

У мэтах садзейнасьці калгасам, калгасьнікам і аднаасобным працоўным сялянам у справе разгортваньня гандлю прадуктам сваёй сельска-гаспадарчай вытворчасьці, на падставе пастаноў СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) ад 6 і 10 мая 1932 г., Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

1. Скасаваць усе існуючыя як рэспубліканскія, так і мясцовыя падаткі і зборы з гандлю калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных сялян прадуктамі сваёй с.-г. вытворчасьці на базарах, пляцох, станцыях чыгунак, прыстанях (хлеб, мяса, птушка, яйкі, малочныя прадукты, гародніна, фрукты і г. д.).

2. Для ўтрыманьня базараў у чыстаце і пакрыцьця расходаў па ўборцы базараў дапусьціць устанаўленьне мясцовага разавага збору, прычым гэты збор не павінен перавышаць за дзень гандлю: з возу—1 рубля, пры гандлі з рук, на латках і г. д.—20 кап., са штукі буйнай жывёлы—1 рубля і са штукі дробнай жывёлы — 50 кап.

3. Забараніць спагнаньне мясцовага разавага збору з гандлю з рук птушкай, яйкамі, малаком, маслам, сырам, які праводзіцца калгасьнікамі і аднаасобнымі працоўнымі сялянамі.

4. Абавязаць мясцовыя саветы максымальна зьнізіць стаўкі арэндных платы за памяшканьні, што спаганяюць са калгасных ларкоў, крам, магазынаў.

5. Устанавіць, што даходы калгасаў і калгасьнікаў ад продажу на рынку прадуктаў сваёй с.-г. вытворчасьці не абкладаюцца сельска-гаспадарчым падаткам.

6. Устанавіць, што даходы працоўных аднаасобных гаспадарак ад продажу на рынку прадуктаў сваёй с.-г. вытворчасьці прыцягваюцца да абкладаньня с.-г. падаткам у разьмеры на вышэй 30 проц. даходаў ад гандлю, аднаведна зьмяніўшы артыкул 50 палажэньня аб с.-г. падатку на 1932 г.

7. Устанавіць, што ларкі, палаткі і крамы, якія адкрываюцца непасрэдна калгасамі для гандлю прадуктамі сваёй с.-г. вытворчасьці, абкладаюцца пашыжанай стаўкай падатку са звароту ў разьмеры 3 проц. ад валавой выручкі.

8. Крамы, магазыны і ларкі, якія адкрываюцца калгаснымі аб'яднаньнямі, саюзамі (раённымі, абласнымі, краёвымі, рэспубліканскімі і саюзнымі) карыстаюцца тымі-ж падатковымі ільготамі, як і каапэрацыя.

9. Гандаль калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных сялян праводзіць па цэнах, якія складваюцца на рынку, а гандаль калгасных аб'яднаньняў па цэнах, не вышэй сярэдня-камэрцыйных цэн у дзяржаўным гандлі.

10. Не дапускаць адкрыцьця магазынаў і крам прыватнымі гандлярамі і ўсяляк выкараняць перакупшчыкаў і спэкулянтаў, прабуючых нажыцца за кошт рабочых і сялян.

11. Прапанаваць цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік неадкладна скасаваць усе пастановы і распараджэньні, якія супярэчаць данай пастанове.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР М. КАЛІНІН.
Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР А. ЕНУКІДЗЭ.

Масква. Крэмль. 20 мая 1932 г.

АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ І ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) І СНК СССР АБ ЗБОЖЖА, ЖЫВЁЛАЗАГАТОЎКАХ, КАЛГАСНЫМ ГАНДЛІ І ДЭКРЭТУ АБ С.-Г. ПАДАТКУ

Рэзалюцыя сходу партыйнага актыву Менскай арганізацыі па дакладу сакратара ЦК КП(б)Б т. ГІКАЛО

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад т. Гікало аб ходзе сяўбы і практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) аб збожжа, і жывёлазагатоўках і калгасным гандлі, аб новым сельска-гаспадарчым падатку, сход партактыву Менскай арганізацыі канстатуе, што дасягнутыя на аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі посьпехі ў выкананьні пяцігодкі за чатыры гады, завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі, будаўніцтва гігантаў індустрыі, ліквідацыя кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі і вялізарнейшае тэхнічнае пераўзбраеньне сельскай гаспадаркі — стварылі ў трэцюю бальшавіцкую вясну ўсе магчымасьці для выкананьня і перавыкананьня плянаў сяўбы, павышэньня ўраджайнасьці, таварнасьці і якасьці сельска-гаспадарчай прадукцыі.

Аднак, ход сяўбы па БССР і Менскім раёне паказвае, што радам арганізацый гэтыя спрыяючыя ўмовы ня былі ў поўнай меры выкарыстаны і што тэмпы сяўбы зьяўляюцца далёка нездавальняючымі.

Актыў адзначае асаблівае адставаньне ў сяўбе прыгарадных каапэрацыйных гаспадарак і саўгасаў Сьвіназаводтрэсту.

Партактыў лічыць, што асноўнымі прычынамі такога нездавальняючага стану веснавой сяўбы зьяўляюцца: многія партыйныя, камсамольскія і савецкія арганізацыі не мабілізаваліся на барацьбу за ранейшую сяўбу, за пасьпяховае выкананьне ў тэрмін плянаў сяўбы; цэлы рад райкомаў, партыйных ячэек, сельсаветаў і калгасаў у зусім невыстарчальнай меры рэалізавалі ўказаньні ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і не ажыцьцявілі ўказаньня аб разгортваньні калгаснай узаемадапамогі па пасеўных матар'ялах, рабочай і цягавай сіле, у наяўнасьці слабае разгортваньне масавай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў, аднаасобнікаў, асабліва ў сувязі з апошнімі пастановамі ЦК УсеКП(б); дапушчаныя ў цэлым радзе выпадкаў перагібы ў адносінах аднаасобнікаў, беднякоў і сераднякоў (несвячасовае прадстаўленьне зямлі, свавольнае скарачэньне норм зямлякарыстаньня, урэзка сядзіб і г. д.); невыстарчальная барацьба ў радзе раёнаў і ячэек з правапартыйнай стаўкай на самацёк, з недастаткам арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, з невыстарчальным націскам на кулацка-заможныя элемэнты, з «лявацкімі» перагібамі, грубейшым адміністраваньнем і свавольнем у адносінах калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў.

Вялізарнейшыя посьпехі на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, як рэзультат разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, выклікаюць шалёную нянавісьць усіх капіталістычных і імпэрыялістычных краін супроць СССР, наблізаючы небясьпеку інтэрвэнцыі супроць краіны, якая будуе сацыялізм. Адкрыта імпэрыялісты ўсіх краін (Францыі, Японіі) шукаюць выхаду з цяжкай крызісу і нарастаючага рэвалюцыйнага руху ў сваіх краінах у новай імпэрыялістычнай вайне і ў першую чаргу супроць СССР, як заўсёды, пры простым падтрыманьні дзяльцоў і пэртый II Інтэрнацыяналу.

Рашткі разгромленага кулацтва ўнутры нашай краіны накіроўваюць усе свае сілы на зрыў сацыялістычнага будаўніцтва і, у прыватнасьці, на разбурэньне калгасаў з сярэдзіны. У радзе раёнаў, дзе масава-палітычная работа сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў падмянялася адміністраваньнем і «лявацкімі» перагібамі, і там, дзе асобныя ячэйкі і камуністы, трацячы клясавае чуцьцё, не правялі рашучай барацьбы з праяўленьнямі правага апартунізму на практыцы, — кулаку ўдалося дабіцца выпадкаў выхадаў беднякоў і сераднякоў з калгасаў, расьцяжваньня і разбазараваньня калгаснай маемасьці. У рэзультаце разгортваньня глыбокай масава-палітычнай работы вакол пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР і задач, пастаўленых у гэтай сяўбе, перамаганьня перагібаў і арганізацыі калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на барацьбу з кулаком, партарганізацыі, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, у радзе выпадкаў адновілі распаўшыя калгасы, дабіліся новага прыпліву ў калгасы і звароту раней выжыўшых з іх.

ВЫХОДЗЯЧЫ З ГЭТАГА, ПАРТАКТЫЎ ЗАКЛІКАЕ ЎСЮ АРГАНІЗАЦЫЮ І ЎСЮ КП(б)Б У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ЗРАБІЦЬ РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ У СПРАВЕ ПАСЬПЯХОВАГА СКАНЧЭНЬНЯ СЯЎБЫ Ў ВЫЗНАЧАНЫЯ ТЭРМІНЫ.

Кожны асобны вучастак работы павінен быць ахоплен канкрэтным апэрацыйным кіраўніцтвам і дапамогай партарганізацый. Толькі вырашаючы пытаньні канкрэтна ў кожным паасобным выпадку, уваходзячы ва ўсе дэталі справы і абстаноўкі, партарганізацыі могуць дабіцца сапраўды бальшавіцкіх посьпехаў па завяршэньні сяўбы.

Гэта павінна быць і будзе забясьпечана пры ўмове ўзмацненьня барацьбы і шпарчэйшага перамаганьня правапартыйнага тэндэнцыі нежаданьня падняць тэмпы сяўбы, стаўкі на самацёк, забываньня барацьбы з кулаком, пры бальшэвіцкім выпраўленьні «лявацкіх» перагібаў, рашучым выкараненьні элемэнтаў адміністраваньня, пры бязумоўным разгортваньні на месцы масавай растлумачальнай работы і замацаваньні яе канкрэтнымі дзеяньнямі па ўшчыльненьні тэрмінаў сяўбы, па паляпшэньні арганізацыі працы, самазамацаваньні ўсяго складу брыгад у полі, наладжаньні ўліку працы, павышэньні адказнасьці калгасьнікаў за даручаны ім грамадзкі сродак вытворчасьці.

ПАРТАКТЫЎ ЛІЧЫЦЬ, ШТО ЎСЕ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ НЕАДКЛАДНА НАМЕЦІЦЬ ПРАКТЫЧНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ ЎСЯГО ПАРТЫЙНАГА І КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ І ШЫРОКІХ МАС РАБОЧЫХ НА НЕАДКЛАДНУЮ ЛІКВІДАЦЫЮ АДСТАВАНЬНЯ, НА СТВАРЭНЬНЕ КРУТОГА ЎЗДЫМУ ТЭМПАЎ СЯЎБЫ ЯК У ПРЫГАРАДНЫХ КААПГАСАХ, ТАК І Ў КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ РАЁНУ І СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ З ТЫМ, КАБ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ СКОНЧЫЦЬ СЯЎБУ ПА ЎСІХ СЭКТАРОХ РАЁНУ.

Для гэтай мэты неабходна поўнасьцю выкарыстаць усю цягавую сілу, дабіцца поўнай нагрузкі трактараў, сваячасовага падвозу гаручага ў поле, наладзіць арганізацыю харчаваньня ў полі і на аснове разгортваньня камуністычных мэтадаў работы і барацьбы за аўладаньне тэхнікай паставіць МТС на перадавыя пазыцыі барацьбы за сваячасовае скончэньне сяўбы.

У КОРАНІ ПЕРАСЯЧЫ ЎСЯКУЮ НЕДАЦЦЭНКУ РАБОТЫ З АДНААСОБНІКАМІ — БЕДНЯКАМІ І СЕРАДНЯКАМІ, ПРЫЧЫМ АСАБЛІВАЯ ЎВАГА ПАВІННА БЫЦЬ ТАКСАМА ЗЬВЕРНУТА І НА РАБОТУ З АСОБНЫМІ АДСТАЛЫМІ БЕДНЯКАМІ І СЕРАДНЯКАМІ, ЯКІЯ ПАД КУЛАЦКІМ УПЛЫВАМ ВЫШЛІ І ЯШЧЭ НЕ ВЯРНУЛІСЯ Ў КАЛГАСЫ.

Партактыў указвае, што бядняк і серадняк — сёнешні аднаасобнік, не ўвайшоўшы ў калгас і нават вышаўшы з калгасу, — ёсьць заўтрашні калгасьнік. Работа з ім павінна быць значна ўзмоцнена. Ячэйкі павінны арганізаваць дапамогу ў сяўбе з боку калгасаў і саўгасаў інвэнтаром, цягавай сілай і насеньнем бедняком і мапамоцным сераднякам — аднаасобнікам, якія сапраўды маюць у гэтым патрэбу.

Неабходна даваць рашучы адпор усякім спробам парушыць цальнасьць зямельнага калгаснага масыву, што зьяўляецца нічым іншым, як імкненьнем кулацтва падрываць калгасную будаўніцтва. Адначасова задача партыйных і савецкіх арганізацый рашуча выпраўляць дапушчаныя ў асобных мясцох перагібы ў адносінах свавольнага скарачэньня норм зямлякарыстаньня беднякам, сераднякам — аднаасобнікам.

АБАВЯЗАК ПАРТЫЙНЫХ, КАМСАМОЛЬСКІХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДАБІЦЦА ПОЎНАГА ЗАСЕВУ АДВЕДЗЕНЫХ ПЛОШЧАЎ БЕДНЯКОМ, СЕРАДНЯКОМ — АДНААСОБНІКАМ.

Партактыў абавязвае ўсе арганізацыі гораду, фабрык і заводаў, устаноў і г. д. ажыцьцявіць штодзённае кіраўніцтва і арганізаваць дапамогу ў справе поўнага забесьпячэньня засеву прыгарадных гаспадарак, арганізаваўшы барацьбу за якасьць апрацоўкі, уздым працоўнай дысцыпліны і забесьпячэньне работы па сяўбе і прапопачнай кампаніі ўдарнымі тэмпамі ў гэтых гаспадарках.

Неабходна ўсямерна ўмацаваць партыйную і камсамольскую праслойку ў саўгасах і калгасах, змагаючыся з практыкай перакідкі камуністаў і камсамольцаў, занятых на вытворчасьці, на навытворчыя работы і пасьлядоўна змагаючыся за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб калгасных кадрах і прыцягваючы да суровай адказнасьці парушаючых гэтыя дырэктывы партыі. Ліквідуючы мэтады кампанейшчыны, ячэйкі абавязаны разгарнуць масавую палітычна-выхаваўчую работу, ахапіць сваім уплывам важнейшыя вытворчыя вучасткі саўгасаў і калгасаў, павысіўшы авангардную ролю камуністаў і камсамольцаў на вытворчасьці.

У цеснай сувязі з пасьпяховым правядзеньнем пасеўнай кампаніі перад партарганізацыяй стаіць пытаньне аб неадкладным разгортваньні вялікай практычнай арганізацыйна-гаспадарчай і палітычна-масавай работы вакол рэалізацыі пастаноў партыі аб збожжа, жывёлазагатоўках і разьвіцьці калгаснага гандлю. На аснове росту індустрыялізацыі, парамогі саўгаснай і калгаснай сыстэмы сельскай гаспадаркі—партыя атрымала магчымасьць дапусьціць зьнижэньне плянаў збожжа,-жывёлазагатовак і шляхам максымальнага разгортваньня таваразвароту краіны і разьвіцьця калгаснага гандлю забясьпечыць далейшае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы і працоўных гораду і вёскі.

Пастановы ЦК і СНК аб збожжа,-жывёлазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю зьяўляюцца важнейшым ва гаром, накіраваным на далейшае ўмацаваньне сельска-гаспадарчай арцелі, на выкарыстаньне ўсіх магчымасьцяй, закладзеных у арцельнай стадыі калгасаў, на павышэньне гаспадарчай самадзейнасьці калгасаў і калгасьнікаў.

Пастанова ЦВК і СНК СССР аб гандлі калгасаў і калгасьнікаў, аб цэнах на таварныя пішкі, аб гандлі беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў дае поўную і бесьперашкодную магчымасьць ім пры акуратным выкананьні абавязацельстваў перад дзяржавай — выкідваць сельскагаспадарчую прадукцыю на рынак і забясьпечыць лепшае снабжэньне гарадоў. Гэта павінна быць выкарыстана для мабілізацыі вялізарнейшых дадатковых рэсурсаў у справе забесьпячэньня рабочых і працоўных гораду і для рашучай барацьбы і выкараненьня спэкуляцыі прыватнікаў і перакупшчыкаў.

Партактыў лічыць неабходным правесьці масавы палітпаход рабочых у калгас, вёску па растлумачэньні і рэалізацыі апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) аб збожжа-жывёлазагатоўках і калгасным гандлі і новым законе аб сельска-гаспадарчым падатку кожнаму калгасьніку, бедняку і серадняку—аднаасобніку. Гэты паход павінен быць арганізаван у бліжэйшую пяцідзеньку.

Неабходна рашуча зламаць апартуністычную недаацэнку і коснасьць у радзе зьвеньняў савецкага, каапэрацыйнага і калгаснага апарату ў адносінах да калгаснага гандлю.

Партактыў даручае бюро гаркому ў бліжэйшыя дні распрацаваць практычныя мерапрыемствы па рэалізацыі пастаноў ЦК аб разгортваньні ў Менску калгаснага гандлю.

Партактыў лічыць, што, мабілізуючы ўвагу на пасьпяховае вырашэньне ўсіх важнейшых задач партыі ў вёсцы і ў першую чаргу задачы пасьпяховага правядзеньня сяўбы, Менская арганізацыя і ўся КП(б)Б не павінна аслабіць, а, наадварот, удзесяцярыць сваю бальшавіцкую энэргію і ўвагу ў барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, барацьбе за паляпшэньне рабочага снабжэньня.

Выяўленыя за апошні пэрыяд факты недапушчальнага адміністраваньня, перагібаў замест правільнага кіраўніцтва масамі, нават разлажэньне паасобных работнікаў (Пятрыкоў, Барысаў, Ветка і інш.) сьведчыць аб яўна слабым разгортваньні крытыкі і самакрытыкі ў радзе партарганізацый. Актыў заклікае Менскую арганізацыю і ўсю КП(б)Б на аснове сьмелага разгортваньня дзейснай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі дабіцца новага ўздыму творчай актыўнасьці і ініцыятывы камуністаў і найшырэйшых мас рабочых і калгасьнікаў, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва і мабілізацыі мас на барацьбу з усімі і ўсякімі скажэньнямі лініі партыі, хвасьцізмам, адміністраваньнем і на выкананьне важнейшых задач, пастаўленых перад усёй КП(б)Б.

Партактыў з усёй рашучасьцю падкрасьлівае, што задачы бальшавіцкага правядзеньня пасеўнай і ўборачнай кампаній, рэалізацыя апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) аб збожжа,-жывёлазагатоўках, калгасным гандлі, новым законе аб с.-г. падатку і аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы, барацьба за прамфінплян, за паляпшэньне рабочага снабжэньня—як ніколі вымагаюць згуртаваньня ўсёй партарганізацыі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б для неаслабнай барацьбы супроць правага апартунізму — агентуры кулака—галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левых» перагібшчыкаў і прымірэнчых адносін да ўсіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі.

Партактыў заклікае ўсю Менскую партарганізацыю і ўсю КП(б)Б разгарнуць работу такімі бальшавіцкімі тэмпамі і дабіцца такой яе якасьці, як гэтаму вучыць ЦК УсеКП(б) і правадыр партыі і рабочай клясы тав. Сталін.

ЛІКВІДАЦЫЯЙ АБЯЗЬЛІЧКІ, УКАРАНЕНЬНЕМ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, ПРАВІЛЬНЫМ УЛІКАМ ПРАЦАДЗЁН—УЗЬНІМЕМ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ ПАЛЯВЫХ БРЫГАД

Брыгады т. т. Стурчанкі і Ігнатовіча актыўна змагаюцца за пяршынства ва ўсебеларускім конкурсе веснавой сяўбы

Ударная брыгада тав. Ігнатовіча

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Брыгадзір т. ІГНАТОВІЧ (калгас «Пралетарская перамога», Карсакаўскага сельсавету) гібка і апэрацыйна кіруе работай сваёй брыгады. Яго мэта—да 25 мая поўнасьцю скончыць сяўбу свайго вытворчага вучастку ў 121 га.

Штодзённа вечарам брыгадзір растлумачвае кожнай групе, кожнаму калгасьніку, што яны павінны рабіць на полі заўтра. Усе 45 членаў брыгады на работу выходзяць сваячасова, без спазьненьня. Нават бываюць выпадкі, калі непрацаздольныя калгасьнікі, убачыўшы дружную работу, самі выходзяць на поле, дапамагаюць энтузіястам. Так, 13-14 мая замест 45 чал. працавала 51 чал. Вызначаную норму па пасадцы бульбы перавыканалі на 2 га.

Лепшыя ўдарнікі брыгады—**Буцько** і **Дземзнцевіч** увесь час перавыконваюць свае нормы выпрацоўкі. У часе пасадкі бульбы па правядзеньні бароздаў замест нормы ў 1,6 га (на двух) яны пры 2-зьменнай рабоце коняй выпрацавалі 3,6 га. Працавалі з раніцы да позьняга вечара—па 16 гадзін у суткі. Не адстае ад іх **Хропік Тамаш** і рад іншых калгасьнікаў-ударнікаў.

Кожны дзень пасьля скончэньня палявых работ брыгадзір тав. Ігнатовіч аглядае інвэнтар. Калі ёсьць паломкі—адразу робіцца рамонт. Але трэба адзначыць, што ў сувязі з поўнай ліквідацыяй абязьлічкі, паломка інвэнтару, псаваньне збруі даведзена да мінімуму.

Правільна наладжаны ўлік стварае вялізарны стымул для ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы. Тав. Ігнатовіч штодзённа акуратна праводзіць абмер зямлі, на заўтра паведамляе брыгадзе колькі яна выпрацавала. Кожную пяцідзеньку запісваюцца працадні ў кніжкі калгасьнікаў. Брыгадзір зачытвае калгасьнікам, колькі за пяцідзеньку выпрацаваў кожны калгасьнік паасобку.

Ударная брыгада № 2, на чале з брыгадзірам т. Ігнатовічам, па-бальшавіцку змагаецца за выкананьне плянаў пасеўнай. Брыгада павінна быць прэміявана. НЭЙДЛІН.

Ільнаводчая брыгада Стурчанкі змагаецца за высокі ўраджай

ЛЕЗНА. Калгас «Авангард», Кабыльніцкага сельсавету, у гэтым годзе сее 826 гэкт. яравых. Насеньнем, за выключэньнем ільну, калгас забясьпечан поўнасьцю (насеньне ільну, як негатунковае, увосень мінулага году было вывезена з сельсавету). Зараз патрэбная колькасьць ільнанасеньня закуплена на ільнабазе і завозіцца.

Але ня ўсякае насеньне вырашае посьпех сяўбы і высокі ўраджай. Добра памятна яшчэ, як у мінулым годзе «Лабаноўскі» сэктар, паводле трапнага выразу калгасьнікаў, «сеяў авёс у рукавіцах». Што пасеяў, тое і зжаў: 40 гэкт. аўса, засеянага згарэўшым насеньнем, загінула. Сумны леташні урок не прапаў бясьсьледна.

Зараз у кожнай брыгадзе, у кожным сьвіране, дзе хаваецца насеньне, вядзецца дакладны ўлік колькасьці і рэгулярна правяраецца якасьць захаваньня насеньня. Мэтад праверкі просты: бярэцца звычайны дрыўляны кій, уторкваецца ў засек і праз некаторы час выцягваецца, мацаецца рукой. Калі не нагрэўся, насеньне не гарыць. Але і па іншых прыкмах можа аказацца насеньне няўсхожым, а таму, каб быць упэўненым у яго якасьці, трэба зрабіць праверку ўсхожасьці.

У гэтых адносінах узорны прыклад паказвае брыгада тав. Стурчанкі. Па даручэньні брыгадзіра, калгасьнік Дзянісенка Цімох Ільліч у звычайным карыце з зямлёй разьбіў 8 вучасткаў і дзевяты ў старым катле. На кожным вучастку—таблічка: «Амбар № 1 (цэнтральны), адказны—Стурчанка», «Амбар № 2, адказны—Блохін», «Амбар № 4, адказны—Храмнікоў А.» і г. д. Дзевяць вучасткаў—дзевяць дошчачак. Розныя культуры з розных месц захаваньня. Узята па 50 зярнят бяз выбару па вялічыні, ня зьверху засеку, а з глыбіні. Вопыт закладзен 30 красавіка, а 7 мая разьвіліся буйныя ўсходы (па 15 см.). Процант усхожасьці вагаецца ад 92 да 98, значыць—высокі процант. Высокаякаснае насеньне брыгады № 1—першая і важнейшая ўмова высокага ўраджаю.

Другая ўмова высокага ўраджаю—раньняя сяўба, тэмпы і якасьць работы. І ў гэтых адносінах ня дрэнныя паказальнікі дае брыгада Стурчанкі.

39 коняй штодзённа працуе на ворыве, вывазцы гною, баранаваньні. Нормы Калгасцэнтру, якія ў асноўным прыняты калгасам, выконваюцца і перавыконваюцца. Як і ў іншых перадавых брыгадах, вытворчыя групы брыгады № 1 разьбіты па зьвеньнях—3-4-5 плугароў у кожным. Ворыва набліжаецца да канца. Пачалося баранаваньне.

Жаночыя групы возяць гной. Самі накапваюць, развозяць, скапваюць, тут-жа растрасаюць. Сьледам за гэтым гной заворваецца. Гэта важна; не дапускаецца засыханьне гною, выветрываньне аміяку.

У брыгадзе тав. Стурчанкі працуюць усе: і мужчыны, і жанчыны, у той час, як у іншых брыгадах гавораць: «для жанчын пакуль што работы няма».

Поўны выхад на работу—гэта вынік правільнага ўліку працы. Выпрацоўка ўлічваецца штодзённа і ў працоўную кніжку заносіцца раз у 5 дзён. Кожны дзень перадавыя і адсталыя групы, зьвеньні, калгасьнікі заносіліся на чырвоную або чорную дошку, а 1 мая гэта дошка была зьнята, бо, як заяўляе брыгадзір тав. Стурчанка, усе падраўняліся.

Калгас «Авангард» у цэлым і яго перадавая брыгада № 1 у прыватнасьці ўключыліся ў спаборніцтва-конкурс на лепшае і хутчэйшае скончэньне веснавой сяўбы. Брыгада Стурчанкі можа і павінна заваяваць пяршынства ў конкурсе, па-ўдарнаму правёўцы сяўбу. А. Мікуцкі.

ЗАСЕВАМ ДАДАТКОВЫХ ГЭКТАРАЎ адказваюць перадавыя калгасы на пастановы ЦК і СНК

Узор канкрэтнай работы

РЭЧЫЦА. (Ад нашага кар. сьпешнай поштай). Калгас ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА, Розенска - Слабодзкага сельсавету, распрацаваўшы пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і мясазагатоўках, аб калгасным гандлі і сельска-гаспадарчым падатку на 1932 год, абавязаўся пашырыць плошчы пад яравым клінам, апрача раней высунутых сустрэчных 45 га, на 10 га, 200 га папару пасеяць кармовымі культурамі. Пашырыць плошчы пад тэхнічнымі супроць мінулага году на 47 га. Павысіць ураджайнасьць супроць леташняга году: па бульбе на 20 проц., па ільну на 23 проц., па насеннай віцы на 63 проц., па кармовай віцы на 15 проц., па ячмені на 28 проц.

Для ажыцьцяўленьня ўзятых на сябе абавязацельстваў, у калгасе будзе сеяцца авёс і проса выключна пратручаным насеньнем. 50 проц. усіх збожжавых культур сеяць радковымі сявяркамі.

У галіне жывёлагадоўлі, калгасьнікі абавязаліся павялічыць стада малочнай жывёлы да канца гэтага году з 337 шт. да 567, стада дойных кароў са 120 шт. да 141, сьвіней з 65 да 215 шт. Для забесьпячэньня жывёлы кармамі па пляну засяваецца 20 гэкт. сіласных культур і 5 га ў парадку сустрэчнага, кораньплодаў 21 га, 25 га вікі на корм і пашыраецца плошча сенажаці на 45 га за лік раскарчовак.

Для продажу лішкаў калгасу пры фабрыцы «Х Кастрычнік» адкрываецца калгасная крама, праз якую калгасьнікі абавязаліся рэалізаваць 15 цэнтн. мукі, 5 цэнтн. сьметанковага масла, 10 цэнтн. малака, 5 цэнтн. бараніны, адну тону гуркоў, 1,5 тон памідораў, 5 тон яблык, паўтоны ігруш, 3 тоны бульбы, 1 тону цыбулі, 1 цэнтн. мукі. БАРСУКОЎ.

На 9 гэкт павялічваюць яравы клін

***

КАПЫЛЬ. (Сьпешнай поштай). Рабочыя саўгасу «Савічы», прапрацаваўшы пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжазагатоўках, калгасным гандлі і с.-г. падатку на 1932 год, абавязаліся скончыць сяўбу ўсіх культур да 25 мая. Высунулі сустрэчны па сяўбе на 9 гэктараў. Абавязаліся выканаць плян здачы прадукцыі дзяржаве ў вызначаны тэрмін.

Калгасьнікі і аднаасобнікі вёскі Красіна, Ляшнянскага сельсавету, у адказ на апошнія пастановы партыі і ўраду абавязаліся поўнасьцю закончыць сяўбу яравых да 25 мая.

Калгасьнікі пашыраюць плошчу пасеву ільну на 1 га і кораньплодаў на 1 га.

На 5 дзён раней тэрміну скончым сяўбу

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу ад наш. спэцкора). У Віцебскім раёне ідзе масавая распрацоўка пастаноў партыі і ўраду аб збожжа- і мясазагатоўках, калгасным гандлі і палажэньня аб новым законе пра с.-г. падатак. Калгасьнікі адказваюць канкрэтнымі самаабавязацельствамі па датэрміновым скончэньні сяўбы, лепшай падрыхтоўцы да ўборачнай.

Калгасны актыў разам з членамі Ялагінскага сельсавету пастанавіў скончыць сяўбу да 1 мая, плян усіх відаў загатовак выканаць у вызначаны тэрмін. Калгасьнікі Цумянскага сельсавету абавязаліся выканаць і перавыканаць свае пасеўныя планы, для чаго шырока разгарнулі сацспаборніцтва і ўдарніцтва на палёх. Паміж брыгадамі заключаны дагавары на сацыялістычнае спаборніцтва ў калгасах імя Сталіна, імя Калініна, «Чырвоны Кастрычнік» і «Бальшавік».

Агульны сход калгасу «Барацьбіт» пастанавіў поўнасьцю скончыць сяўбу да 25 мая.

Зарубежны.

Хроніка ўсебеларускага конкурсу на лепшае і хутчэйшае скончэньне сяўбы

НОВА-БЕЛІЦА. (Па тэлеграфу). Саўгас «ВЗЗУВІ», Улукоўскага сельсавету, Гомельскага раёну, уключыўся ва ўсебеларускі конкурс. Рабочыя саўгасу абавязаліся скончыць сяўбу да 25 мая і пераключыцца на дапамогу адстаючым калгасам. Умовы конкурсу даведзены да брыгады і кожнага рабочага. ГАФТ.

***

МСЬЦІСЛАЎЕ. (Па тэлеграфу). Раён уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы. Пры райвыканкоме складзена конкурсная камісія і прапанавана стварыць конкурсныя камісіі пры кожным сельсавеце. 22 мая ў сельсаветы накіравана 26 асоб партактыву тэрмінам на 10 дзён для дапамогі саўгасам, калгасам і аднаасобнікам у хутчэйшым скончэньні сяўбы. Райгазэта таксама ўключылася ў конкурс. На мясцох разгортваецца работа нізавога друку. ВАЙНШТЭЙН.

***

ЖЫТКАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Раён уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае і хутчэйшае скончэньне сяўбы, у раён паслана 25 чалавек райпартактыву.

Старшыня РВК БУДЗЬКО.
Райза БУЯНАЎ.
МТС ТОЎСТУХ.
РКС ГАНЧАРОЎ.

МТС ПРАПУСКАЮЦЬ АПОШНІЯ ТЭРМІНЫ ПАСЕВУ ЯРАВЫХ

НА 20 МАЯ ПЛЯН СЯЎБЫ ВЫКАНАН НА 15,8 ПРОЦ.

БЫЦЬ У ПЕРШЫХ РАДОХ ПАСЕЎНАЙ

20 мая мінуў апошні тэрмін пасеву асноўных культур па БССР. Выключэньнем зьяўлялідца толькі пасеў тэхкультур і гародніны па паўночных раёнах, для якіх апошні тэрмін — 25-30 мая. МТС таксама прапусьцілі ранейшы тэрмінны сяўбы. Апошняя дэкада хаця і дала прырост на 11,1 проц., але гэты факт ні ў якім разе ня можа нас задаволіць.

Прыблізна 3 мая амаль усе МТС прыступілі да сяўбы і за гэты час засеялі 77.900 га. Плян на 20 мая выкапан на 15,8 проц. Жывёлагадоўчаканаляводчыя МТС выканалі плян на 34 проц., а ўсе іншыя МТС ідуць сяўбу нездавальняючымі маруднымі тэмпамі.

Так, ільна-малочныя МТС засеялі 23.367 га (11 проц.), бульбяна-жывёлагадоўчыя 39.103 га (19,9 проц.), садова-гародныя — 5.376 га (10,1 проц).

Самае большае выкананьне плянаў мы маем па наступных МТС: **Мсьціслаўская**, выканала плян на 33 проц., **Ветрынская** — 22,8 проц., **Вузьдзенская** — 38,4 проц., **Жлобінская** — 28,6 проц., **Капыльская**—

Аб задачах прафсаюзаў СССР на даным этапе разьвіцьця

Прамова тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на IX зьезьдзе прафсаюзаў 28 красавіка 1932 году

1. Вытворчыя саюзы і міжсаюзныя арганізацыі

Таварышы! Дазвольце перш за ўсё спыніцца на ўзаемадносінах і рабоце вытворчых саюзаў і міжсаюзных арганізацый.

15 студзеня 1931 г. ЦК партыі і УсеЦСПС прынялі пастанову аб разбуйненьні існаваўшых 22 саюзаў і стварэньні 44 саюзаў. Такім чынам, колькасьць прафсаюзаў і іх ЦК павялічылася ў два разы. Пастанова аб разбуйненьні мае ня толькі арганізацыйнае значэньне. Яна зьвязана з асноўнымі палітычнымі пастановамі партыі аб задачах прафсаюзаў. Гэтыя пастановы знайшлі сваё найбольш яркае выяўленьне ў кароткім, але выразным лёзунгу «прафсаюзы тварам да вытворчасьці».

Гэты лёзунг для прафсаюзаў ёсьць і застанецца яшчэ на доўгі час цэнтральным лёзунгам рэканструкцыйнага пэрыяду.

Лёзунг «тварам да вытворчасьці» сустрэў супраціўленьне правых ухілістаў, бо яны выходзілі з меншавіцка-трацкісцкай установкі — процістаўленьня інтарэсаў пралетарыяту, інтарэсаў матар'яльнага паляпшэньня яго быту інтарэсам сацыялістычнай прамысловасьці.

За час з VIII да цяперашняга IX зьезду саюзаў нашы прафсаюзы, пад кіраўніцтвам партыі, ня толькі разьбілі ідэі і практыку трэд'юніяністаў, ня толькі зразумелі значэньне лёзунгу партыі аб перабудове прафсаюзаў, але і на справе павярнуліся тварам да вытворчасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва бязумоўна сталі асноўным зьвяном у ажыўленьні і паляпшэньні работы прафсаюзаў. Гэта і ёсьць рацыяючы палітычны вынік, які вы падвялі тут на зьезьдзе.

Але ў практыцы, у штодзённай рабоце па рэалізацыі асноўных задач мы яшчэ маем вялізарныя недахопы, якія неабходна сёньня-ж выявіць і выправіць, у прыватнасьці, недахопы ў арганізацыйным пытаньні.

Пастанова ЦК партыі і УсеЦСПС аб стварэньні 22 новых вытворчых саюзаў ёсьць завяршэньне барацьбы з правымі прафработнікамі ў арганізацыйным пытаньні. Гэтай пастановай ЦК партыі ставіў задачу ўзьняць ролю вытворчых саюзаў і тым самым больш пасьпяхова правесьці лёзунг «тварам да вытворчасьці» ў штодзённай практычнай рабоце.

Дазвольце мне прачытаць некаторыя пункты пастановы ЦК партыі (яна і лягла ў аснову пастановы V пленуму УсеЦСПС):

«Выходзячы з таго, што існуючая структура саюзаў, якія яднаюць вялізарныя масы рабочых рознастайных галін прамысловасьці і гаспадарчых аб'яднаньняў, затрудняе канкрэтны ўдзел прафсаюзаў у кіраўніцтве прамысловасьцю, арганізацыю ўсё ўзрастаючай актыўнасьці рабочых мас вакол канкрэтных пытаньняў вытворчасьці, больш дакладны ўлік вытворчых і бытавых асаблівасьцяй паасобных груп рабочых, лепшае іх абслугоўваньне і барацьбу з бюракратызмам, — лічыць неабходным, на аснове вытворчага прынцыпу пабудовы прафсаюзаў, разбуйніць рад прафсаюзаў, стварыўшы рад новых саюзаў».

ЦК партыі тут зыходзіў з асноўных, рашаючых задач прафсаюзаў. У гэтай-жа пастанове ёсьць рад пунктаў аб вытворчых сэкцыях і рабоце з вядучымі прафэсіямі, якія, на жаль, не знайшлі яшчэ свайго належнага адлюстраваньня ў практыцы многіх прафарганізацый.

«У мэтах большага прыцягненьня рабочых да вырашэньня вытворчых пытаньняў і забесьпячэньня лепшага абслугоўваньня іх, арганізаваць у саюзах вытворчыя сэкцыі па важнейшых галінах прамысловасьці... Побач са стварэньнем сэкцый, шырока ўжываць правядзеньне спэцыяльных сходаў, вытворчых нарад па прафэсіях (ліцейшчыкаў, лекальшчыкаў, сьлёсараў, бракоўшчыкаў, машыністаў, забойшчыкаў, трактарыстаў, падмайстраў, раклістаў і г. д.), вылучаючы ў цэхах побач з упаўнаважанымі па цэху і ўпаўнаважанага па вядучых прафэсіях».

Вы бачыце ў гэтай пастанове пэўную мэтаімкнёнасьць, якая заключаецца ў тым, каб мы ад універсалізму, ад агульных разважаньняў і кіраўніцтва «ў вогуле і цэлым» падыйшлі канкрэтна да кожнай галіны прамысловасьці і нават прафэсіі ў паасобку.

Ці можам мы з вамі сёньня сказаць, што гэтыя заданьні праведзены ў жыцьцё, што іх зразумелі ў патрэбнай меры? Мы не памылімся, калі скажам, што ня ўсе зразумелі іх у патрэбнай меры.

Гаворыць, напрыклад, што нават ва УсеЦСПС бываюць такія выпадкі, калі адзін работнік з апарату УсеЦСПС можа скасаваць тую ці іншую пастанову ЦК саюзу. Праўда гэта, ці не (**З месца:** «Бывае»). Гэта няправільна. Скасаваць пастанову можа толькі прэзыдыум, або сакратарыят УсеЦСПС. ЦК саюзу павінен быць простым непасрэдным чынам зьвязан з УсеЦСПС, а крайаддзелы з крайсаўпрофамі. Яшчэ больш часта падобнага роду парушэньні ўстановак на ініцыятыўныя, моцныя вытворчыя саюзы бываюць у абласьцях і раёнах.

А пытаньне-ж аб вытворчых саюзах і іх узаемадносінах з міжсаюзнымі арганізацыямі (гарадзкімі і абласнымі) ня новае. На працягу раду год у савецкім прафруху з лепінскімі ўстаноўкамі ў арганізацыйных пытаньнях змагаліся дзьве апартуністычныя тэндэнцыі: бюракратычнай цэнтралізацыі ўсёй прафработы ў міжсаюзных арганізацыях (так званы «адзіны саюз») і цэхавыя куставыя тэндэнцыі паасобных саюзаў.

У пэрыяд ваеннага камунізму вытворчасьць знаходзілася ў зруйнаваным стане, большая частка кадравых прамысловых пралетараў пайшла з заводаў на фронты. У прафруху дайшлі да таго, што ў пастановах III зьезду прафсаюзаў (красавік 1920 г.) проста ўказвалася, што «заканчаная схэма саюзнага будаўніцтва прывядзе да зьніжэньня самадзейных вытворчых аб'яднаньняў і да ператварэньня іх у сэкцыі агульнарасійскага цэнтру прафэсыянальнага руху».

Яшчэ больш акрэсьлена выказаўся IV зьезд прафсаюзаў (май 1921 году), указаўшы, што: «Агульны ход разьвіцьця расійскага прафруху ясна акрэсьлівае тэндэнцыю, якая намецілася ў арганізацыйным разьвіцьці прафсаюзаў у бок усё большай канцэнтрацыі работы вытворчых саюзаў у цэнтры і на мясцох у міжсаюзных аб'яднаньнях і паступовага ператварэньня, такім чынам, у адзіны саюз з вытворчымі сэкцыямі».

Ня гледзячы на тое, што ў 1922-1923 г. г. на словах была ўзята ўстаноўка на ўзмацненьне ролі ЦК саюзаў, на справе практыка старога кіраўніцтва УсеЦСПС да VIII зьезду прафсаюзаў выяўлялася ў празьмерпай цэнтралізацыі, бюракратычным імкненьні згуртаваць усю работу ў міжсаюзных арганізацыях, ігнараваньні самадзейнасьці цэнтральных камітэтаў прафсаюзаў, што было ўвязана з агульным курсам супроць самакрытыкі ў прафсаюзах і супраціўленьнем навароту прафсаюзаў «тварам да вытворчасьці».

У той-жа час мы мелі і другую апартуністычную, бюракратычную крайнасьць. Напомню «вядомы» трацкісцкі Цэктран і ня менш «вядомы» шляпнікаўскі ЦК мэталістаў. І трацкісты і шляпнікаўцы прабавалі ператварыць ЦК гэтых саюзаў у цэхавыя, бюракратычныя замкнутыя арганізацыі, супроцьпастаўляемыя астатнім прафсаюзам і пралетарыяту ў цэлым.

І тое і другое пярэчыць лепінскай лініі нашай партыі, і тое і другое адлюстроўвае сабой чужыя пралетарыяту плыні. Трацкісты адлюстроўвалі сабой дробна-буржуазную частку работнікаў дзяржаўнага апарату, якая абюракрацілася, адарвалася ад рабочых мас, прыкрывалася «левымі» фразамі. Шляпнікаўцы адлюстроўвалі чужую бальшавізму анарха-сындыкалісцкую ідэалёгію. Правыя прафсаюзьнікі са старога кіраўніцтва УсеЦСПС прадстаўлялі сабой групу прафэсыяналістаў, якая адарвалася ад мас, абюракрацілася і адлюстроўвала ўплыў меншавіцка-кулацкай ідэалёгіі. Яны культывавалі на працягу раду год трэд'юніяністкую лінію ў прафруху, знайшоўшую, у прыватнасьці, сваё практычнае выяўленьне ў нежаданьні разьвіваць і ўмацоўваць ролю вытворчых саюзаў, бо вытворчая работа саюзаў і ўзмацненьне ўдзелу ў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны наогул не ўваходзілі ў кола іх інтарэсаў.

Нашы цяперашнія прафсаюзы, на чале з новым кіраўніцтвам УсеЦСПС, у вялізарнай сваёй большасьці выкарчоўвалі караньні праваўхілісцкай, сын дыкалісцкай і трацкісцкай ідэалёгіі. Апіраючыся на ўдарніцтва, прафсаюзы праявілі сябе, як баявая сіла ў барацьбе за пяцігодку, за чатыры гады. Нашы цяперашнія прафсаюзы, пад кіраўніцтвам партыі, накіроўваюць мільённыя масы па правільным шляху. Усё пытаньне зараз заключаецца ў тым, каб яшчэ лепш арганізаваць прафсаюзам сваю практычную работу, устанавіць правільныя ўзаемадносіны і падзел працы паміж міжсаюзнымі арганізацыямі і вытворчымі саюзамі, у прыватнасьці, паміж УсеЦСПС і ЦК саюзаў.

Мы павінны змагацца як супроць уніўэрсалізму і пустазвонства ў міжсаюзных арганізацыях, якія перашкаджаюць праяўленьню ініцыятывы рабочых у вытворчых саюзах, так і супроць цэхавай замкнутасьці і вузкага дзяляцтва ў паасобных вытворчых саюзах.

Умацоўваючы міжсаюзныя арганізацыі, як арганізацыі, што яднаюць усе прафсаюзы данай тэрыторыі, мы павінны рашуча ўмацаваць паасобныя вытворчыя саюзы зьверху да нізу, ад ЦК да заўкому і мясцкому, бо толькі такая ўстаноўка можа палегчыць прафсаюзам іх канкрэтны ўдзел у кіраўніцтве прамысловасьцю і найлепшае абслугоўваньне запатрабаваньняў рабочых мас, прыстасоўна да асаблівасьцяй іх вытворчасьці і іх прафэсіі.

Гэта павінна знайсьці сваё выяўленьне ў канкрэтным падзеле абавязкаў паміж прафарганізацыямі. Возьмем асноўныя функцыі прафсаюзаў.

Калі паспрабаваць падзяліць усю работу і акрэсьліць, у каго згуртаваць пытаньні вытворчасьці, дык адказ ясны: вядома, у ЦК саюзаў. Мы маем цяпер такія складаныя машыны, у нас разьвілася такая магутная і рознастайная вытворчасьць, што кіраўніцтва па-старому ўжо не падыходзіць. Мала сказаць — «таварышы, узьнімеце прадукцыйнасьць працы», трэба ўмець яе ўзьняць.

Я быў па аўтазаводзе ў Ніжнім-Ноўгарадзе і бачыў там адну машыну, якую можна назваць «машынай з вышэйшай адукацыяй» (**сьмех**). Гэта машына сама робіць складаныя штампы. Калі гэтыя штампы рабіць уручную і паставіць самага кваліфікавага рабочага, дык ён будзе безьліч часу капаца ля варштату. Дык трэба-ж ведаць, вывучыць гэту машыну, для таго, каб правільна арганізаваць і нармаваць на ёй працу рабочага. А для таго, каб разумець, чаму машына робіць тыя ці іншыя апэрацыі, трэба гэтай справай непасрэдна займацца. Гэта ЦК саюзаў павінны цьвёрда ведаць і гэтым яны павінны ўпарта займацца.

Возьмеце, колькі машын у нас вырабляецца? У нас выдан альбом машын савецкай вытворчасьці. Трэба было-б яго раздаць членам зьезду. Раздалі яго вам, таварышы? (**З месца:** не). Вельмі шкода. Гэта трэба было-б выправіць, трэба было-б сёньня-ж дастаць альбом і раздаць усім дэлегатам зьезду. Вы ўбачыце, колькі машын будуюць машынабудаўнічыя заводы СССР. Адкуль-жа ня толькі УсеЦСПС, але нават ЦК саюзаў ведаць усе гэтыя машыны, калі-б у яго нават было сем пядзей у лобе. Таму і ЦК саюзу павінны мець вытворчыя сэкцыі і групы па вядучых прафэсіях. Адна справа — нармаваць працу і зарплату на вытворчасьці бульбакапалак, а другая справа — маторы, складаныя машыны.

Пытаньнямі вытворчасьці павінны займацца ЦК саюзаў, а ўпор у рабоце УсеЦСПС павінен быць на разглядзе канфліктаў і спрэчак, якіх паасобныя саюзы вырашыць ня можа, і ад іх ісьці да агульна-плянавых пытаньняў.

Гэта-ж адносіцца ў поўнай меры і да пытаньняў зарплаты. Хто можа лепш разумець тарыфікацыю і нармаваньне працы, як не ЦК данай прамысловасьці?

Якія функцыі павінны застацца ў галіне зарплаты і арганізацыі працы ва УсеЦСПС? Заканадаўства аб працы, агульныя нормы і ўказаньні па калектыўных дагаворах пры ўстанаўленьні дырэктыў з НК цяжкай прамысловасьці, НК лёгкай прамысловасьці і інш. Але галоўныя функцыі ў пытаньнях зарплаты павінны быць у ЦК саюзаў.

Возьмем другую групу пытаньняў — «сацыяльна-бытавыя» пытаньні. Да рэчы, назва «сацыяльна-бытавыя» — гэта вельмі бязглуздая назва, якая нічога не гаворыць. Аказваецца, у гэту мудрую назву «сацыяльна-бытавыя» пытаньні ўключаюцца дзесяткі важнейшых функцый: снабжэньне, бульба... У прафсаюзаў яна ператвараецца ў «сацыяльна-бытавую бульбу» (**сьмех, аплёдысмэнты**), сталовыя, сацыяльнае страхаваньне і г. д.

Тут-жа я павінен падкрэсьліць, што сацстрах, таварышы, — гэта мільярды рублёў. І калі пекаторыя прафсаюзьнікі скардзяцца, што гаспадарнікі грашыма распараджаюцца, машынамі распараджаюцца, а мы, прафсаюзьнікі, нічым матар'яльным ня можам распараджацца (**сьмех**), дык я напамінаю, да прыкладу, гэтыя мільярды па сацстраху — распараджайцеся, здолейце гэтыя грошы выкарыстаць рацыянальна для шырокіх мас рабочай клясы.

Далей — ахова працы, жыльлёвае будаўніцтва, снабжэньне, гароды — усё гэта аб'яднаецца аднэй глыбокадумнай назвай: «сацыяльна-бытавыя функцыі». Дык вось, калі разьмежаваць гэтыя функцыі, дык хто на чым павінен згуртаваць сваю ўвагу?

Сацстрах. Існуюць вытворчыя касы і агульныя. Відавочна, сацстрахам у цэлым будзе займацца УсеЦСПС, а вытворчымі касамі ЦК саюзаў.

Ахова працы — упор на ЦК. УсеЦСПС павінен займацца разам з Наркампрацай пытаньнямі заканадаўства аб ахове працы. Канкрэтная арганізацыя аховы працы на прадпрыемствах — гэта справа вытворчых саюзаў. Хто павінен займацца аховай працы ў вугальнай прамысловасьці? Вядома, саюз вугальшчыкаў, і ў першую чаргу яго ЦК.

Жыльлёвае будаўніцтва. Тут, відаць, будзе два шляхі. Тое, што датычыць камунальнага будаўніцтва, гэта застаецца за УсеЦСПС і міжсаюзнымі арганізацыямі (АСПС і райпрафсаветамі), што-ж датычыць прамысловага жыльлёвага будаўніцтва, дык гэтыя пытаньні будуць у ЦК саюзаў.

Снабжэньне. Пытаньнямі снабжэньня рабочых у цэлым павінны займацца УсеЦСПС і міжсаюзныя арганізацыі, таму, што гэта зьвязана з работай агульна дзяржаўных органаў. Але работай ЗРК, сталоўкі на прадпрыемстве павінны займацца вытворчыя саюзы. Асабліва сталоўкі на заводзе — гэта простая справа заўкому, асноўнай ячэйкі вытворчага саюзу.

Пытаньні культуры. Тут трэба ўпор зрабіць на УсеЦСПС. Пры гэтым пытаньні аўладаньня тэхнікай культсправы адыйдуць, вядома, да вытворчых саюзаў, а агульная культработы — ліквідацыя непісьменнасьці, школы, разумны адпачынак, дапамога піянэрарганізацыям і г. д. — да УсеЦСПС.

Кадры. Да вытворчых саюзаў павінна адыйсьці падрыхтоўка кадраў для вытворчасьці, для ўстаноў. Што-ж датычыць кадраў прафсаюзных, дык тут вытворчыя прафсаюзы павінны рыхтаваць для сябе кадры, а міжсаюзныя арганізацыі павінны дапамагаць маламоцным саюзам ажыцьцяўляць кантроль і мэтадалёгічнае кіраўніцтва, а таксама весьці падрыхтоўку кадраў для міжсаюзных арганізацый.

УсеЦСПС і іншыя міжсаюзныя арганізацыі павінны непасрэдна кіраваць шэфработай прафсаюзаў (над вёскай, над Чырвонай арміяй), удзелам прафсаюзаў у паляпшэньні дзяржапарату, сумеснай работай з органамі РСІ і інш.

За УсеЦСПС павінна застацца міжнародная работа. Вядома, і ў вытворчых саюзаў будзе міжнародная сувязь — з прафсаюзамі іншых краін, але агульная інтэрнацыянальная работа і сувязь павінны быць ва УсеЦСПС.

Статыстыка і ўлік павінны застацца за УсеЦСПС.

УсеЦСПС і саўпрофы цэнтр цяжару сваёй арганізацыйнай работы павінны перанесьці на праверку выкананьня.

УсеЦСПС і міжсаюзныя арганізацыі павінны-б мець групу высокакваліфікаваных інструктараў-інспэктараў або кантралёраў, якія будуць правяраць выкананьне дырэктыў УсеЦСПС і міжсаюзных арганізацый адпаведнымі вытворчымі саюзамі. Пытаньні праверкі выкананьня для УсеЦСПС узрастаюць выключна. Яны павінны быць у цэнтры яго работы.

Значыць, у ЦК саюзаў галоўны ўпор павінен быць на пытаньнях вытворчасьці і арганізацыі працы, зарплаты і нармаваньня працы, аховы працы, жыльлёва-прамысловага будаўніцтва, кадрах (вытворчых і для сябе), пытаньнях снабжэньня, у адносінах работы сталовых, ЗРК і г. д.

УсеЦСПС павінен зрабіць галоўны ўпор у сваёй рабоце на агульных пытаньнях снабжэньня, заканадаўстве аб працы, агульных нормах калдагавароў, культурнай рабоце, па агульных пытаньнях кадраў і падрыхтоўкі міжсаюзных кадраў, статыстыцы, уліку, міжнароднай рабоце і праверцы выкананьня.

Вось прыкладны падзел працы паміж міжсаюзнымі арганізацыямі і вытворчымі саюзамі.

Я думаю, што пасьля зьезду УсеЦСПС павінен будзе распрадаваць усе гэтыя пытаньні ня толькі ў частцы ўзаемадносін УсеЦСПС і ЦК саюзаў, але і ў адносінах работы заўкомаў і мясцкомаў.

Заўкомы і мясцкомы павінны заняць значна большае месца ва ўсёй рабоце прафсаюзаў, чым займалі да гэтага часу. Гэта, уласна кажучы, аснова прафсаюзнай работы, бо рабочая маса згуртавана на фабрыках і заводах. Работнікі вышэйшых і сярэдніх зьвеньняў прафсаюзаў павінны большую частку свайго часу праводзіць на прадпрыемствах, дапамагаючы фабзаўкомам найлепшым чынам арганізоўваць масы і рэалізаваць дырэктывы партыі і прафсаюзаў.

2. Аб сутнасьці работы прафсаюзаў

Натуральна, што адно толькі размеркаваньне абавязкаў і правільная яго арганізацыя яшчэ ня вырашаюць пытаньня. Але правільная арганізацыйная структура палягчае правільную пастаноўку самой работы прафсаюзаў па сутнасьці.

Што-ж зьяўляецца асноўным, самым істотным у рабоце прафсаюзаў?

Пры разглядзе задач прафсаюзаў на розных этапах мы бачым, што асноўная роля прафсаюзаў на ўсіх этапах пралетарскай дыктатуры — гэта роля школы камунізму. На кожным паасобным этапе зьмяняюцца паасобныя элемэнты зьместу, форма прафработы, але застаецца галоўнае — функцыя школы камунізму.

У пэрыяд непасрэдна пасьля Кастрычніка прафсаюзы побач з правядзеньнем рабочага кантролю ўзялі на сябе работу па арганізацыі вытворчасьці і кіраўніцтва прадпрыемствамі. З радоў прафработнікаў фармаваліся ў асноўным кадры гаспадарнікаў у першыя гады рэвалюцыі. Фабзаўкомы, органы рабочага кантролю, прафарганізацыі зьявіліся магутнай кузьняй, у якой выкоўваліся будучыя камандзіры савецкіх прадпрыемстваў.

У пэрыяд ваеннага камунізму, праводзячы прафсаюзныя мабілізацыі на фронт, фармуючы харчовыя атрады ў барацьбе за хлеб, саюзы практычна выхоўвалі ў рабочых масах сьвядомасьць агульна-клясавых інтарэсаў, абавязак ахвяраваць прыватнымі інтарэсамі паасобных груп рабочых агульнай справе пралетарыяту, справе савецкай улады. Суботнікі і гераічная работа па забесьпячэньні фронту зброяй, вопраткай, абуткам, харчамі былі непасрэдным працягам работы па ўмацаваньні франтоў грамадзянскай вайны. Прафсаюзы зьявіліся магутнымі рэзэрвуарам, з якога савецкая ўлада і Чырвоная армія чарпалі лепшых змагароў за справу рабочай клясы.

З пераходам да нэпу партыя асабліва падкрэсьлівала ролю прафсаюзаў, як школы камунізму. Тав. Ленін, палемізуючы з трацкістамі і з прымірэнцамі ў прафсаюзнай дыскусіі ў 1921 г., пісаў:

«... Не «з аднаго боку — школа, а з другога нешта іншае», а з усіх бакоў — пры данай спрэчцы, пры данай пастаноўцы пытаньня Троцкім прафсаюзы ёсьць школа, школа аб'яднаньня, школа салідарнасьці, школа абароны сваіх інтарэсаў, школа гаспадараньня, школа кіраўніцтва. Замест таго, каб зразумець і выправіць гэту нарэнную памылку т. Троцкага, т. Бухарын даў сьмешную папраўчку: «З аднаго боку, з другога боку». (Ленін, «Яшчэ раз аб прафсаюзах»).

Бачыце, з якой шырынёй ставіць Ленін пытаньне аб прафсаюзах, як школе камунізму: «школа аб'яднаньня, школа салідарнасьці, школа абароны сваіх інтарэсаў, школа гаспадараньня, школа кіраўніцтва».

Лепінскае акрэсьленьне прафсаюзаў, як школы камунізму, — цэнтральнае ў лепінскім вучэньні аб прафсаюзах — больш за ўсё скажалася апартуністамі, больш за ўсё сустракала іх процідзеяньне.

Троцкі прабаваў ператварыць прафсаюзы ў дапаможны бюракратычны апарат пры гаспадарчых органах, пошта сярэдняе паміж палітаддзеламі і аддзеламі эканомікі працы. Шляпнікаў прадстаўляў сабою адваротны бок трацкісцкай мэдалі, у процівагу трацкісцкаму «адзяржаўленьню» прафсаюзаў прапанаваў «абсаюзіць» дзяржаву, перадаўшы кіраўніцтва прамысловасьцю ў рукі прафсаюзаў, г. зн., зноўтакі зьнішчыць прафсаюзы, як школу камунізму.

Апартуністычна скажалі ролю прафсаюзаў, як школы камунізму, і правыя прафработнікі, на чале з Томскім. Яны ня бачылі зьмен у зьмесьце школы камунізму на розных этапах дыктатуры пралетарыяту, асабліва ў рэканструкцыйны пэрыяд.

Процістаўляючы ў меншавіцка-трацкісцкім духу інтарэсы рабочых інтарэсам сацыялістычнай прамысловасьці, абарончыя функцыі прафсаюзаў іх вытворчай рабоце, яны або наогул абыходзілі моўчкі ролю прафсаюзаў, як школы камунізму, або аднабакова тлумачылі зьмест школы камунізму, як школы аб'яднаньня, школы абароны сваіх інтарэсаў, адкідваючы ленінскія акрэсьленьні «школы гаспадараньня, школы кіраўніцтва», «школы кіраўніцтва сацыялістычнай прамысловасьцю (а потым паступова зямляробства)». Адсюль і іх падтрыманьне кулацкай палітыкі правых ухілістаў у партыі.

Рабочая кляса на адным месцы не стаіць. Яна зьмяняецца, расьце. У яе ўліваюцца сотні тысяч, мільёны новых рабочых. Напрыклад, на лепшым маскоўскім заводзе — аўтазаводзе імя Сталіна — 90 проц. рабочыя — новыя, маладыя рабочыя, якія толькі ўчора працавалі ў сельскай гаспадарцы. Іх-жа трэба выхоўваць, перарабляць.

Тав. Сталін у рабоце «Да пытаньняў ленінізму» так пісаў аб прафсаюзах:

«Прафсаюзы можна назваць пагалоўнай арганізацыяй пануючай у нас рабочай клясы. Яны зьяўляюцца школай камунізму. Яны вылучаюць са свайго асяродзішча лепшых людзей для кіруючай работы па ўсіх галінах кіраўніцтва. Яны ажыцьцяўляюць сувязь паміж перадавымі і адсталымі ў складзе рабочай клясы. Яны злучаюць рабочыя масы з авангардам рабочай клясы».

Прашу зьвярнуць увагу на гэту клясычную фармулёўку, якая для ўсіх нас мае выключна важнае значэньне: «ажыцьцяўляюць сувязь паміж перадавымі і адсталымі» рабочымі.

Адсталых рабочых у нас яшчэ шмат. Мы не павінны ільсьціць рабочым, гэта ня ў нашых бальшавіцкіх звычках. Маса новых рабочых, якія ўліваюцца ў рады пралетарыяту, часта прыносіць на прадпрыемствы дробна-буржуазныя перажыткі і настроі. Перадавыя рабочыя павінны весьці за сабой адсталых. Гэта значыць падымаць адсталых да ўзроўню перадавікоў, гэта значыць ня хаяць, не дражніць, а кіраваць адсталымі, выхоўваць іх палітычна, гаспадарча, арганізацыйна.

Сёньня, калі ў нас ідзе барацьба, жорсткая барацьба з клясавым парагам на ўсіх франтох, барацьба з труднасьцямі, сёньня, таварышы, пытаньне аб згуртаваным авангардзе, пытаньне аб вылучэньні перадавікоў-рабочых і аб кіраўніцтве з іх боку адсталымі рабочымі мае выключна вялікае значэньне для лёсаў усяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Выхаваньне новай дысцыпліны, як падкрэсьліваў ня раз Ленін, зьяўляецца аднэй з асноўных форм клясавай барацьбы пры дыктатуры пралетарыяту. І роля прафсаюзаў у гэтых адносінах асабліва вялікая.

Мне перадавалі, што паасобныя таварышы пытаюцца: а ці патрэбны будуць прафсаюзы ў другой пяцігодцы?

Зразумела, што гутаркі аб тым, што ў другой пяцігодцы ў сувязі з пабудовай бясклясавага грамадзтва прафсаюзы будуць лішнія, ня вытрымліваюць найменшай крытыкі.

Нельга аддзяляць пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ад умацаваньня пралетарскай дыктатуры, як магутнага вагара ліквідацыі клясаў. Мы павінны быць асабліва пільны і выразны ў гэтых пытаньнях, бо за лёзунг аб адміраньні дзяржавы пры цабудове бясклясавага грамадзтва зараз прабуюць уханіцца клясава-чужыя элемэнты, якія ахвотна па-свойму радуюцца «паскоранаму адміраньню» пралетарскай дзяржавы іменна таму, што яна пралетарская.

XVII партканфэрэнцыя зусім мела рацыю, калі яна падкрэсьліла «нямінучасьць захаваньня, а ў некаторых выпадках і ўзмацненьня буржуазных уплываў на паасобныя пласты і групы працоўных, нямінучасьць яшчэ на працягу доўгага часу праяўленьня чужых пралетарыяту клясавых уплываў у асяродзішча рабочых і нават у партыю», дадаўшы пры гэтым, што «з прычыны гэтага перад партыяй стаіць задача ўмацаваньня пралетарскай дыктатуры і далейшага разгортваньня барацьбы з апартунізмам і асабліва з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе».

Як бачыце, мы па-бальшавіцку, па-леніску разумеем барацьбу за бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Мы спалучаем гэта з задачай умацаваньня пралетарскай дыктатуры. Узрастае, значыць, і роля прафсаюзаў, як станавога хрыбта пралетарскай дыктатуры, як школы камунізму, якая перавыхоўвае дзесяткі мільёнаў працоўных «у сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва». Для таго, каб яны сталі сьвядомымі будаўнікамі бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, неабходна адпаведна выхоўваць шырокія масы рабочых.

3. Не расплывацца ў рабоце, знаходзіць асноўнае зьвяно!

У гэтых умовах пытаньне аб далейшым паляпшэньні работы прафсаюзаў выключна важнае. Яшчэ да гэтага часу ёсьць асобныя работнікі прафсаюзаў, якія ня зусім разумеюць ролю і значэньне прафсаюзаў на даным этапе.

«Быў-бы я, — думае такі работнік, — дырэктарам заводу або трэсту, тады-б ясна была работа: распараджайся і кіруй. А старшыня заўкому, дый старшыня ЦК саюзу не распараджаюцца грашыма, ня пішуць загаду», — і адсюль ён робіць вывад, што прафсаюз мала што можа зрабіць. А некаторыя паглыбляюць пытаньне і гавораць: «Калі дрэнна, дык з прафсаюзу патрабуюць, а калі добра, дык прыпісваюць другім, а прафсаюзу нічога» (**сьмех, аплёдысмэнты**).

Рана вы аплёдуеце, таварышы, пельга згаджацца з такімі разважаньнямі. Дазвольце зьяўляецца нездаровым і для некаторых новых прафработнікаў.

Галоўнае, зразумела, не ў загадах і не ў адміністраваньні, галоўны біч у рабоце прафсаюзьнікаў — гэта тое, што яны расплываюцца ў рабоце, хапаюцца за ўсё і ўстанаўляюць «роўнасьць» паміж усімі сваімі функцыямі. Але адказваць за ўсё нельга, будзь ты хоць сямі пядзей ва лбе, — трэба ўмець выбіраць галоўнае ў рабоце.

Многія прафработнікі за ўсё хапаюцца, «каб людзі не папракнулі». Часта прафработнік думае так: «Вось выступлю з дакладам. Калі не скажу аб аднэй з задач — адразу на цугундэр возьмуць. Не, я ўжо ўсё скажу, мяне ня зловіш, «шалишь». (**Сьмех**). Або сядзіць чалавек, працуе і думае: «Прыдзе інструктар або работнік друку мяне абсьледаваць і вылавіць, што саюз дрэнна аддаваў увагу такому-то пытаньню. «Шалишь», мяне ня зловіш. Я скажу, што аддаваў і гэтаму кавалачак увагі, і аб гэтым у мяне ў пратаколе ёсьць. І аб калгасах, і аб культуры, і аб тэхніцы масам, і аб сталовай, і аб добраахвотных таварыствах — аб усім па кавалачку. Інакш гаворачы — ураўнілаўка ў рабоце суцэльная: кожнаму па кавалачку.

Што на справе атрымліваецца з такой работы? Нічога добрага не атрымліваецца. Рабочым-жа не папяровыя пастановы патрэбны — ім важна ведаць, ці палепшылася справа. Некаторыя прафарганізацыі надзвычай пімат увагі аддаюць пастановам, рэзалюцыям, тады як іншы раз без пастановы зробіш у дзесяць раз больш, чым з пастановай.

Мы не павінны расплывацца, а павінны паставіць пытаньне аб галоўных зьвеньнях работы, аб тым, каб ведаць, за якое зьвяно ўхапіцца, як галоўнае. Толькі пры гэтай умове можна разьлічваць на сур'ёзны посьпех у рабоце.

Папрабуем намеціць некаторыя рашаючыя зьвеньні.

Калі ўзяць як выходны пункт, як баявую праграму для работы інэсьць указаньняў т. Сталіна, дык патрэбна падкрэсьліць, што т. Сталін даў іх для ўсіх пралетарскіх арганізацый, для партыйных і камсамольскіх арганізацый, савецкіх і гаспадарчых органаў, для кааперацыі і прафсаюзаў. Але гэтыя арганізацыі зусім не павінны адна другую паўтараць, рабіць паралельна адну і тую-ж работу. Кожная арганізацыя павінна мець свой спэцыфічны падыход, сваё асноўнае зьвяно ў выкананьні шасьці ўказаньняў т. Сталіна.

Зразумела, у нас ня можа быць ведамственнага размеркаваньня, пры якім мы-б сказалі, што «гэта — твой вучастак», «гэта — твой», а да другога табе справы няма.

Але ўпор у рабоце кожнай арганізацыі павінен быць розны. Напрыклад, партыя адказвае за ўсё, аб'яднае ўсё, яна кіруе ўсімі органамі дыктатуры пралетарыяту, але і ў парт'ячэйкі ёсьць сваё галоўнае зьвяно.

Якое галоўнае зьвяно ў заводзкіх ячэек, у райкомаў? У іх галоўнае зьвяно заключаецца ў тым, каб яны змагаліся за правядзеньне генэральнай лініі партыі, каб яны выхоўвалі партыю, як вядучы авангард, які працуе ва ўсіх органах і які палітычна кіруе масай. Парторганы не павінны загружаць сябе ўсімі дэталямі савецкай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы. Трэба кіраваць заўкомам, трэба кіраваць райпрафсаветам, крайпрафсаветам, але ня трэба браць на сябе ўсіх дэталяй, усёй практыкі асобных галін работы, ня трэба падмяняць сабою гэтыя органы.

Гаспадарнік адказвае, перш за ўсё, за гаспадарку. Ён адказвае, зразумела, і за снабжэньне рабочых і іх абслугоўваньне, але галоўны ўпор — гэта арганізацыя вытворчасьці, тое, каб ня было паломак, прастояў, каб рабочы не цярпеў ад гэтага, каб праводзілася рацыяналізацыя, зьніжаўся сабекошт, павышалася якасьць прадукцыі, выконваўся-б прамфінплян.

Прыходзяць да нас у ЦК або ў МК іншы раз «трыкутнікі» прадпрыемстваў — старшыня заўкому, сакратар парткому і дырэктар. Пытаеш:

— «Ну, таварышы, якія ў вас самыя хваравітыя месцы на заводзе?»

— «Ды вось, ведаеце, не хапае ў нас такіх-то дэталяй, такіх-то машын», — гаворыць дырэктар. Тымі-ж словамі яму ўторыць сакратар парткому, таксама адказвае і старшыня заўкому.

Здавалася-б, дырэктар лепш ведае вытворчасьць — адказвай у першую чаргу за яго. Прафсаюзьнік павінен у першую чаргу адказваць за рабочых, за тое, каб вырашыць іх патрэбы, каб нармаваньне працы было правільнае. Што з таго, што мне заўкомшчык будзе дэманстраваць свой «дзяржаўны сьветапогляд» і кругавід у «сусьветным маштабе», а ў той-жа час ня бачыць агідпасьцяй з арганізацыяй працы, перавыдатку зарплаты, або што матальшчыцы (па тэкстыльнай фабрыцы), якая цягае на сябе скрыпкі са шпулькамі, няправільна зьнізілі зарплату на 6 руб. у месяц. Трэба было прыехаць сакратару МК на фабрыку, каб работніца паскардзілася, і несправядлівасьць зьнішчылі. Ну, што значыць гэты «дзяржаўны кругавід», калі заўкомшчык не прымячае элемэнтарных пытаньняў арганізацыі працы і зарплаты рабочых.

Заўкомы ў нас раскідваюцца нязвычайна. Яны маюць вялізарную кол

Аб задачах прафсаюзаў СССР на даным этапе разьвіцьця

Прамова тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на IX зьезьдзе прафсаюзаў 28 красавіка 1932 году

Паглядзеце, як працуе заўкомшчык. Я спэцыяльна правяраў гэта ў свой час. Ён прыходзіць раніцой на завод і думае: «Ну, сёньня пайду ў цэх, займу зарплатай». Але ён знаходзіць у заўкоме 10-15 чалавек, якія чакаюць, што заматалі, у 3 гадзіны прыйшоў абсьледаваць інструктар, у 4 гадзіны выклікалі ў саюз, і так прайшоў увесь дзень. Заматаўся, ня змогшы вызначыць і вырашыць аспоўныя пытаньні—пытаньні патрэб рабочых, пытаньні зарплаты і арганізацыі працы. Гэта патрэбна ў коралі зьмяніць.

Сіл у заўкомаў шмат, ударнікі — вось яго аспоўная сіла, на іх трэба абапірціся. Ударнікі—гэта цэнтральная фігура ў прафсаюзах.

Лёзунг «прафсаюзы тварам да вытворчасьці», аспоўны ў барацьбе з правымі ў прафсаюзах, застаецца ў поўнай сіле на даным этапе. Аднак, няправільна было-б яго разумець як дубліваньне прафарганізацыямі ўсёй работы гаспадарчых органаў. Кожная арганізацыя мае сваё аспоўнае зьвяно, свой спэцыфічны падыход. Калі прафсаюзьнік паўтарае за гаспадарнікам агульныя месцы аб вытворчых патрэбах, праблемах, дасягненьнях данага прадпрыемства, гэта яшчэ ня значыць, што ён павярнуўся тварам да вытворчасьці. Тварам да вытворчасьці ў сваёй прафсаюзнай рабоце — гэта значыць у пытаньнях зарплаты, нармаваньня працы, снабжэньня, жыльлёвага будаўніцтва быць на першым месцы.

Для прафсаюзаў у шасьці ўказаньнях тав. Сталіна галоўнейшымі, рашаючымі зьяўляюцца пытаньні зарплаты і нармаваньня працы, аховы працы, снабжэньня і жыльля. Іменна адсюль павінны прафсаюзы «ісьці» да вытворчых пытаньняў.

Возьмем такі прыклад. У капальні адбылося забурэньне ваганэткі, з прычыны чаго цэлы састаў ваганэтак стаў і ня рухаецца. Што атрымліваецца ад гэтага? Ад гэтага забойчык сядзіць бяз справы, у яго вяльзарны завал вугалю, і далей ён працаваць ня можа. Наверсе стаяць адкатчыкі і сартавальшчыкі, бо няма ваганэтак. Як павінны ставіць прафсаюзьнікі гэта пытаньне? Гаспадарнік гэта пытаньне паставіць з пункту гледжаньня вытворчасьці, прафсаюзьнікі-ж галоўным чынам (я гавару «галоўным чынам» таму, што і савецкі гаспадарнік абавязан займацца абслугоўваньнем рабочых, іх зарплатай, бытам і савецкі прафработнік павінен цікавіцца агульнымі пытаньнямі вытворчасьці) павінны ад скаргі забойчыка, ад рабочай заявы або прапановы перайсьці да вытворчых пытаньняў. Прышоў у заўком забойчык і скардзіцца: «Я сяджу паўдня ў забоі, зарплата панізілася, пазбаўляюся преміі» і г. д.—«Чаму сядзіш?—«Ды вось ваганэткі забурыліся».—«А ну, давай высьветлім, чаму забурыліся, ці забурыліся таму, што ня змазаны, ці таму, што рэйкі зламаны або няправільна ўкладзены, або можа ваганэткі дрэнна адрамантаваны і г. д.?» Склікаецца, скажам, вытворчая нарада і тут-жа абгаворваюць гэта, як і рад іншых канкрэтных пытаньняў. Ставіцца на ёй канкрэтнае пытаньне, напрыклад, скарга забойчыка, і з гэтай скаргі разгортваецца ўся сума пытаньняў адкаткі або ўсёй падземнай гаспадаркі.

Тое-ж самае і ў тэкстылі, машынабудаўніцтве і г. д.

Або возьмем новы парадак аплаты браку і прастояў. Ён яшчэ больш канкрэтызуе ўдзел прафсаюзаў у паляпшэньні вытворчасьці. Барацьба з прастоямі і бракам—гэта і вытворчыя задачы і пытаньні зарплаты. Тут ужо кожны рабочы, нават самы адсталы, без вялікай філёзофіі разумее: «Чорт вазьмі, завод дрэнна працуе, няма электраэнэргіі, машыны стаяць, далі мне дрэнны мэталь з ракавінамі, я з яго нічога добрага зрабіць не магу, атрымліваецца брак, гэта б'е і прадпрыемства па прамфінпляну і мяне па кішэні».

Мы павінны арганізаваць усіх рабочых на актыўную барацьбу з прастоямі і бракам. У гэтай барацьбе арганічна спалучаюцца клопаты аб павышэньні зарплаты рабочых з барацьбой за прамфінплян.

Змагаючыся з прастоямі і бракам, рабочы павінен зацікавіцца ня толькі сваім варштатам, ня толькі сваёй брыгадай і цэхам, але і цэхамі-пастаўшчыкамі, і электрастанцыяй, і заводамі, якія снабжаюць яго прадпрыемства сырцом, апаламі, машынамі.

Тут-жа машынабудаўнічы рабочы абавязкова возьме за жабры мэталюрга або электрыка. Атрымліваецца ўзаемная зацікаўленасьць, праяўленьне ініцыятывы на вытворчых нарадах, абгаварэньне пытаньняў не адцягнена, ня «ўвогуле і цэлым», а канкрэтных пытаньняў, што непасрэдна цікавіць рабочых.

Мы павінны паставіць работу так, каб такарны або мэханічны цэх данага заводу мог прад'явіць рабочым іншых цэхаў або нават заводаў-пастаўшчыкоў свой рахунак: «Як-жа, мілыя таварышы, вы працуеце? Дзе-ж салідарнасьць рабочай клясы, дзе сумесная барацьба за сацыялізм, калі вы нам даяцё такі мэталь, які б'е і па вытворчасьці і па нашым заработку».

Ткачыхі прад'явяць другі рахунак: «Як-жа, дарагія таварышы прадзільшчыкі, вы даяцё такую пражу, якая нікуды ня варта, і калі я, ткачыха, пачынаю ткаць, ніткі рвуцца. Такая пража б'е і фабрыку па прамфінпляне і мяне па кішэні. Ці нельга вас, таварышы прадзільшчыкі, папрасіць лепш працаваць. Абгаварэце пытаньне, раскрыйце вашы карты, чаму вы даяцё такую дрэнную пражу?».

У гэтых пытаньнях адкрываецца вялікае поле дзейнасьці і для УсеЦСПС і саўпрофаў. Ім прыдзецца разглядаць канфлікты і заявы асобных вытворчых саюзаў адзін на другога. Без дапамогі міжсаюзных арганізацый асобныя вытворчыя саюзы часта ня змогуць дабіцца патрэбных рэзультатаў у прадпрыемстве або вытворчасьці, якія аб'ядноцца другім саюзам. Але аспоўная вытворчая работа, аспоўная барацьба з бракам і прастоямі, паўтараю, павінна быць сканцэнтравана на заводзе і, значыцца, у вытворчых саюзах.

Прафработнікі павінны «ісьці» ад пытаньняў зарплаты і тарыфікацыі нармаваньня і аховы працы да агульных пытаньняў вытворчасьці, увязваючы канкрэтныя патрэбы рабочых з інтарэсамі сацыялістычнай прамысловасьці.

Некаторыя хныкаючыя прафработнікі часамі пагаварваюць, што ў іх «улады» мала. Гэта няправільна, у пытаньнях зарплаты, напрыклад, і нармаваньня вы маеце ўладу на 100 проц., вы можаце ўсе пытаньні вырашаць. Ня можа быць такога становішча, каб прафсаюзьнік унёс мэтазгодную прапанову, якая дае карысьць гаспадарцы і рабочым, а яе не прынялі. Калі гэта часамі можа быць, дык гэта будзе бюракратычнае скажэньне, з якім партыя змагаецца і будзе змагацца.

У гэтым сэнсе патрэбна прымусіць партыйныя камітэты—заводзкія, раённыя, абласныя,—каб яны аддавалі больш увагі прафсаюзнай рабоце, рай прафсаветам, вытворчым саюзам, заўкомам, як органам, якія выконваюць важнейшыя функцыі, што маюць выключнае значэньне для лёсу сацыялістычнай гаспадаркі.

Дапамога з боку партыі прафсаюзам у іх рабоце па вырашэньні важнейшых пытаньняў зарплаты, нармаваньня працы і ўсіх іншых пытаньняў, што датычаць жыцьця і быту рабочых, павінна была і будзе забясьпечана. А калі сярод партработнікаў ёсьць бюракраты,—а мы ня ручаемся, што іх няма, — давайце іх сюды, але не наогул скардзьцеся, а ўказвайце канкрэтна: дзе, у якім раёне аказаўся бюракрат, які зьняў заўкомшчыка, ня лічачыся з прафсаюзам, або парушыў элемэнтарныя інтарэсы прафсаюзнай работы. Партыя зможа заклікаць да парадку такіх работнікаў.

Зарплата, нармаваньне працы, пытаньні снабжэньня, пытаньні жылбудаўніцтва — гэта тыя аспоўныя зьвены, за якія пралетарыят і яго партыя маюць права спаганяць з саюзаў больш, чым за які-небудзь іншы вучастак прафработы. Гэта ня значыць, што прафработнікі адсоўваюцца ад ўдзелу ў кіраўніцтве вытворчасьцю. Яны павінны бязумоўна прымаць удзел у кіраўніцтве вытворчасьцю і прымаць яшчэ большы і актыўны ўдзел, чым зараз, але да вытворчых пытаньняў яны павінны падыходзіць, адпраўляючыся па пераважнасьці ад пытаньняў зарплаты, арганізацыі працы, снабжэньня, жыльля, ад работы рабочых вытворчых нарад, ад уліку прапаноў ударнікаў і рэзультатаў сацспаборніцтва.

У галіне снабжэньня ў прафсаюзаў вялізарныя магчымасьці. Часта бязьдзельле, няўменьне арганізаваць савецкі гандаль прыкрываюць агульнымі гутаркамі «тавараў мала». Так, у нас **не хапае тавараў**, попыт нязвычайна вырас. Але гэта няправільна, што ў нас тавараў мала. Вялізарных мас тавараў мы з вамі ня ўмеем яшчэ па-сапраўднаму і правільна давесьці да спажыўца.

Часта думаюць, што, намеціўшы плян разьмеркаваньня тавараў, мы ўжо вырашылі задачу. Гэта—глупства. Тавары ляжаць на складах. Плян намецілі, каб тавары накіраваць туды-то. А працоўчыя на складах часта робяць ня так, як патрабуецца. Па складах буйных людзей у нас няма. У кладоўшчыка-ж рэальнай улады больш, чым у заг. аддзелам або сакратара парткому. Сакратар «устаноўкі дае», рэзалюцыі піша, а ў кладоўшчыка ключы ад рэальных тавараў, ад масла, белай мукі, яек. Бескантрольнасьць кладоўшчыкаў, работнікаў магазынаў, іх дрэнны склад вядуць да масавых раскрадваньняў. А ісьці на работу кладоўшчыкамі, заг. складамі, заг. магазынамі работнікі больш буйныя, камуністы і беспартыйныя актывісты ня хочуць. Чаму, пытаемся, адкуль такое чванства?

Мы, напрыклад, у Маскве паслалі 8.000 камуністаў-адказных работнікаў для праверкі булачных і пякарняў, дзе шмат крадуць хлеба. Выявілі шмат агідпасьцяй. Калі праз 10 дзён мы некалькі затрымалі гэтых людзей, некаторыя з іх пачалі хваляваца: «МК быццам-бы хоча прызначыць нас загадчыкамі булачнымі і пякарнямі, —як-жа гэта магчыма, я-ж работнік больш высокага рангу».

Многія з іх адкрыта думаюць, што калі яны сядзяць і пішуць паперы, дык вырашаюць больш важныя пытаньні, чым пытаньні снабжэньня рабочых.

Трэба прафсаюзьнікам ісьці ў пякарні, булачныя, на склады, на базы, берагчы тавары, як вока, не на паперы, не ў рэзалюцыях, не ў фармулёўках яркіх і фразістых, а рэальныя тавары—мэтры мануфактуры, тоны хлеба, масла, яйкі і інш. Гэта важней, чым некаторыя высокапарныя рэзалюцыі. Гэта значна палепшыць рабочае снабжэньне.

4. Увага патрэбам асобных рабочых, „дробязям" рабочага быту

За справаздачны пэрыяд мы дабіліся значных посьпехаў у справе паляпшэньня матар'яльных і культурных умоў жыцьця рабочых. Аб гэтым даволі падрабязна гаварыў т. Швэрнік у сваім дакладзе. Напы прафсаюзы, павярнуўшыся «тварам да вытворчасьці», шмат займаліся пытаньнямі матар'яльнага становішча рабочых. Правільна зрабіў зьезд, прыняўшы рэзалюцыю, якая ўхваляе дзейнасьць УсеЦСПС, бо, бязумоўна, прафсаюзы зрабілі шмат. Але трэба зрабіць яшчэ больш і ў асаблівасьці па частцы клопату аб патрэбах асобных рабочых.

Мы часта апэруем вялікімі лічбамі, сотнямі тысяч, мільёнамі рабочых. І гэта статыстыка плюс агульныя, адцягненыя рэзалюцыі часамі засланяюць ад апарату, нават прафсаюзнага, твар жывога, канкрэтнага рабочага з яго горам і радасьцю, з яго запатрабаваньнямі. Трэба дабіцца, каб асобныя рабочыя маглі адчуваць, што прафсаюз іх абараняе і ім дапамагае.

Іменна ў гэтым напрамку ЦК УсеКП(б) прыняў спэцыяльную пастанову, а У пленум УсеЦСПС распрацаваў практычна пытаньне аб перабудове кас узаемадапамогі. Але да гэтага часу яны працуюць вельмі дрэнна, іх перабудовы зусім ня відаць.

Прывяду выпадак з прадзільшчыцай Малаканавай. На сходзе яна расказала, што яна ўдава. У яе двое дзяцей, зарплату атрымлівае невялікую: уехала ў кватэру, а да яе жыла другая кватарантка, якая завінавацілася 78 руб. Цяпер з Малаканавай адразу спаганяюць гэты доўг. «Калі заплачу, чым пракармлю дзяцей, а калі не заплачу, патражаюць з кватэры выселіць. Куды ня ткнуся, ніадзе не дапамагаюць». І яна скардзіцца, бо становішча ў яе нялёгкае. Няўжо нельга было прафарганізацыі пахадайнічаць за яе, вылучыць спэцыяльнага таварыша ёй у дапамогу, каб дабіцца зьняцьця кватэрнага доўгу, які няправільна спаганяецца з яе, парэшце, дапамагчы ёй праз касу ўзаемадапамогі. Але прафарганізацыя аказалася тут у нецях, праявіўшы нічуласьць да патрэб работніцы.

Можна было-б прывесьці яшчэ рад прыкладаў, калі асобны рабочы ўпадае часова ў асаблівую галечу, напрыклад, захварэла жонка, дзеці або сам захварэў і кватэру няма на каго пакінуць, трэба наняць чалавека для прыгляду, а грошай няма. Тут якраз на дапамогу павінны прыйсьці касы ўзаемадапамогі, але яны, на жаль, працуюць дрэнна, хоць грошай у іх даволі.

Возьмеце квартплату ў заводзкіх дамох. Хто правяраў, ці правільна яна ўстаноўлена? Відавочна, у радзе заводзкіх дамоў квартплату бяруць больш, чым патрэбна, у радзе выпадкаў яна значна вышэй камунгасаўскай. Хто перашкаджаў прафсаюзам правяць сваю ініцыятыву ў гэтай справе і дабіцца ўстанаўленьня правільнай квартплаты? Гэта-ж лёгка, правоў і магчымасьцяй у прафсаюзаў у краіне пралетарскай дыктатуры колькі хочаце.

Прафарганізацыі павінны канкрэтна падыходзіць да кожнага пытаньня, да кожнага рабочага, кожнай работніцы, аказваючы ім дапамогу і падтрыманьне, праяўляючы чулыя адносіны, даючы выразныя адказы на ўсе надзенныя і вострыя пытаньні, якія ўзьнікаюць у рабочых.

Тав. Сталін атрымлівае вялікую колькасьць лістоў са скаргамі, ён на іх адказвае перш за ўсё тым, што прымушае адпаведныя органы выпраўляць несправядлівасьць. Шмат лістоў атрымліваюць таксама бюро скаргаў РСІ, пракуратура, газэты. Але-ж прафсаюзы ў першую чаргу павінны тут праявіць актыўнасьць. Нашы-ж прафработнікі ўваходжы ў ЦК, ЦКК, СНК, МК, крайком, райком, куды хочаце, яны могуць і павінны ставіць усе гэтыя пытаньні, аб усім сыгналізаваць і дабівацца выпраўленьня недахопаў.

І няўжо калі-небудзь хто-небудзь з бальшавікоў, сумленных рэвалюцыянэраў можа папракнуць прафсаюзніка: «Чаго ты чапляешся да мяне з такімі пытаньнямі?» Так можа сказаць толькі бюракрат, якога партыя павінна гнаць са сваіх радоў. Няма больш гнаровай задачы для бальшавіка-рэвалюцыянэра, які змагаўся дзесяткі год за справу рабочай клясы, як справа дапамогі рабочым, справа паляпшэньня становішча рабочых **(бурныя аплёдысмэнты).**

Прафработнікі павінны дабіцца такога становішча, каб рабочы са сваімі запатрабаваньнямі ішоў у першую чаргу ў свой саюз. Гэта можна ажыцьцявіць ня дэкрэтам, не рэзалюцыяй аб асобных «правох», а практычнай работай, тым, што рабочыя на практыцы ўбачаць, што саюз уважліва адносіцца да іх запатрабаваньняў і ўмее дабівацца задаволеньня справядлівых патрабаваньняў і просьбаў.

У некаторых прафарганізацыях мы наглядаем чыноўніцкае «благодушие», казённы аптымізм, адсутнасьць самакрытыкі.

Мы павінны яшчэ больш разгарнуць пралетарскую самакрытыку ў прафсаюзах, накіроўваючы яе лёза супроць прафработнікаў, якія ігнаруюць запатрабаваньні асобных рабочых, якія з бюракратычнай бязьдушнасьцю адносяцца да таго, што атрымала назву «дробязяй рабочага быту», але гэта ня дробязі, а рашаючыя зараз пытаньні.

Работа тэй ці іншай прафарганізацыі павінна ацэньвацца ў першую чаргу тым, наколькі саюз зьвязан з масай, ведае настрої рабочых, умее арганізоўваць рабочых і весьці іх па правільным шляху, колькі наступае скаргаў, заяў, адозваў рабочых, як яны вырашаны прафарганізацыяй.

З усіх відаў прафсаюзнай статыстыкі самы неабходны—гэта ўлік рэзультату рабочых лістоў, заяў, прапаноў, скаргаў.

Тут асабліва да рэчы будзе напомніць пункт з рэзалюцыі XI зьезду УсеКП(б), напісанай Леніным:

«Сувязь з масай, г. зн. вялізарнай большасьцю рабочых (а затым і ўсіх працоўных), зьяўляецца самай важнай, самай аспоўнай умовай посьпеху якой-бы там ні было дзейнасьці прафсаюзу.

Зьвязу да самага верху арганізацыя прафсаюзаў і іх апарату павінна быць створана і праверана практычна на вопыце доўгага раду год. Неаб ходна сыстэма падбору адказных таварышоў з ліку камуністаў, якія павінны жыць рабочым жыцьцём, ведаць яго ўздоўж і ўпоперак, умець беспамылкова азначыць па любым пытаньні ў любы момант настрої масы, яе сапраўднае імкненьне, патрэбы, мысьлі, умець азначыць бяз ценю фальшывай ідэалізацыі ступень яе сьвядомасьці і сілу ўплыву тых або іншых забабонаў і перажыткаў краіны, умець заваяваць сабе бязьмежнае давер'е масы таварыскімі адносінамі да яе, клапатлівым задаваленьнем яе патрэб».

Гэтыя-ж мысьлі ня раз падкрэсьліваліся ў выступленьнях т. Сталіна. У 1925 г., адказваючы на пытаньні ў Сьвярдлоўскім універсытэце, ён сказаў:

«Вядомы, што нядаўнія канфлікты, якія разгараліся ў тэкстыльным раёне, ускрылі назіраныя гэтых балячак (часткова адрыў ад шырокіх мас рабочай клясы.—Л. К.) у цэлым радзе нашых партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

Для таго, каб перамагчы гэтыя труднасьці, неабходна перш за ўсё дабіцца таго, каб вызваліць нашы партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі ад яўна бюракратычных элемэнтаў, прыступіць да абнаўленьня складу фабзаўкомаў, абавязкова ажывіць вытворчыя нарады, перанесьці цэнтр цяжару партыйнай работы на буйныя вытворчыя ячэйкі і забясьпечыць іх лепшымі партыйнымі работнікамі.

Пабольш увагі і ўдумлівасьці да запатрабаваньняў рабочай клясы, паменш бюракратычнага фармалізму ў практыцы нашых партыйна-прафэсыянальных арганізацый, **пабольш чулясьці і адзьўлівасьці да пачуцьця клясавай годнасьці рабочай клясы—такава цяпер задача»** (падкрэслена мною.—Л. К.).

Гэтыя словы застаюцца ў поўнай сіле і ў сучасны момант. Прафработнікі павінны быць чулымі да запатрабаваньняў рабочага. Яны павінны рэгулярна наведваць рабочыя кватэры і інтэрнаты, гутарыць ня толькі з рабочымі, але і з членамі іх сем'яў, дасканала ведаць, чым жыве, чым цікавіцца кожны рабочы, які яднаецца імі. У гэтым зарука сувязі з масай, у гэтым умова яшчэ больш шырокай мабілізацыі мас на выкананьне грандыёзных задач другой пяцігодкі.

5. Аб кадрах прафработнікаў, гераічным будаўніцтве і труднасьцях

Ці ёсьць у прафсаюзах моцныя кадры прафработнікаў? Так, ёсьць. За гэтыя гады, пасьля VIII зьезду прафсаюзаў, у нас вылучыліся і выхаваліся дзесяткі і сотні тысяч добрых арганізатараў з радоў лепшых ударнікаў. Калі раней, да VIII зьезду прафсаюзаў, старое кіраўніцтва УсеЦСПС не падтрымлівала генэральнай лініі партыі, процідзейнічала ёй, дык цяпер, я не памылюся, калі скажу, што даны зьезд адлюстроўвае думку ня толькі тых дэлегатаў, якія тут прысутнічаюць, але адлюстроўвае настрої соцень тысяч новых прафсаюзных кадраў, якія сумленна і шчыра змагаюцца за генэральную лінію партыі **(бурныя аплёдысмэнты).**

Усё пытаньне заключаецца ў тым, каб умець на практыцы ажыцьцяўляць пастаўленыя задачы.

Часта мы таленавітых рабочых, добрых байцоў, працуючых як героі на вытворчасьці, выбіраем у заўком, а яны там ўпадаюць у замяшаньне, ня ўмеюць правільна падыйсьці да работы. Перахвальваць работнікаў пам пельга, самаашуканьнем займацца няма чаго:

Мы кінулі на прафработу вялізарную колькасьць праверaных барацьбітоў з партыйнай работы. Гэта добрыя людзі, найлепшыя работнікі. Але ня ўсе яны яшчэ навучыліся прафсаюзнай рабоце, ня ўсе яны аўладалі, калі можна так сказаць, тэхнікай прафработы. І ў прафрабоце ёсьць тэхніка, разумеючы пад тэхнікай прафработы нешта больш складанае, чым машыну або варштат. Дык вось, ня ўсе яшчэ здолелі гэтай тэхнікай аўладаць.

Таму перад намі стаіць задача навучыць усіх гэтых людзей, якія былі высунуты на прафработу, ня кідацца імі, а дапамагчы ім, падтрымаць іх.

І тут мы павінны сказаць аб недапушчальнасьці тэй вялікай цякучасьці, якая наглядаецца сярод прафработнікаў, такой цякучасьці сярод прафработнікаў, якая часамі перавышае цякучасьць рабочай сілы на прадпрыемствах **(сьмех).** Мы павінны змагацца з гэтай цякучасьцю так, як мы змагаемся з цякучасьцю на фабрыках і заводах. Мы павінны замацоўваць людзей, кваліфікаваць і навучаць іх. Мы павінны ў той-жа час палітычна іх выхоўваць.

Вядома, мы маем у прафсаюзным асяродзішчы ў пераважнай большасьці вытрыманых людзей, якія змагаюцца за генэральную лінію партыі. Але можна сустрэць і такіх работнікаў, якія часам упадаюць у замяшаньне ад самых пазначных труднасьцяй.

Ёсьць і такія, якія гаворыць: «Чорт мяне панёс на прафработу. Сядзеў я на вытворчасьці, або на партыйнай рабоце, дык было лягчэй, больш пэўнасьці. Ці нельга мне ўцячы з прафработы, тым больш, што можна падвесьці тут тэарытычную базу ў выглядзе разважаньня аб непатрэбнасьці прафсаюзаў у другой пяцігодцы» **(сьмех, аплёдысмэнты).**

Само сабой зразумела, што падобныя настрої ня могуць сустрэць спачуваньня з нашага боку. Партыя іх асуджае. Прафработнікі пасгаўлены рабочай клясай і яе партыяй на адзін з самых адказных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва. І мы будзем правяраць іх, як барацьбітоў за справу рабочай клясы, правяраць на практычнай рабоце, на канкрэтных пытаньнях клопатаў аб паляпшэньні становішча рабочых і разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі.

Рабочая кляса і партыя будуць падтрымліваць і заахвочваць усіх прафработнікаў, хто здолее на справе праводзіць ленінскую лінію партыі. Гэта лінія праверана ў барацьбе за сацыялізм. Яна праверана на тых вялізарных посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва, якія мы маем. Даклады, якія вы тут выслухалі, гэта яркa паказалі.

Мы ведаем, што маем яшчэ шмат труднасьцяй. Але яны ў корані адрозьніваюцца ад труднасьцяй капіталістычных краін. Там крызіс, беспрацоўе, голад і галеча, якія давяць дзесяткі мільёнаў рабочых, сотні мільёнаў працоўных. Там труднасьці заняпаду, руйнаваньня капіталізму.

У нас труднасьці ўзьдыму, труднасьці росту, труднасьці, якія мы перамагаем упартай барацьбой, настойлівай работай, перамагаем таму, што вядзем правільную ленінскую палітыку пад кіраўніцтвам ЦК партыі і яе праводыра тав. Сталіна **(бурныя аплёдысмэнты).**

У той час, калі рабочы ў любой краіне капіталізму, кладучыся спаць, ня ведае, які будзе яго лёс раніцой, ці ня выганяць яго з заводу на вуліцу, ці не застанецца ён з сям'ёй галадаць, савецкі рабочы можа быць спакойным, што ні ён, ні яго дзеці без работы не застануцца.

Нашы маладыя рабочыя, уцягнутыя ў вытворчасьць, ня ведаюць, а старыя рабочыя забываюць, якім цяжкім кашмарам давіў на рабочага жах беспрацоўя. Таму, калі мы сёньня гаворым, што ў нас няма беспрацоўя, гэта ня проста адно з многіх дасягненьняў. Гэта выраз нашых рашаючых буйнейшых перамог.

Але побач з перамогамі мы не забываем, што ў нас шмат труднасьцяй. Мы будуем Днепрабуд з камбінатам заводаў, Урала-Кузьнецкі камбінат з Магнітабудам, Чалябінскім трактарным заводам і г. д. Гэта — перамогі, але гэта і труднасьці, бо нам за граніцай доўгатэрміновых крэдытаў не даюць. Калі атрымліваем крэдыт, дык крэдыт невялікі і на вельмі кароткі тэрмін. Мы павінны купляць машыны за сваё золата. Мы ўкладваем мільярды. Гэта—мільярды, якія склаліся з капеечак, што здабываюцца мазалямі, упартай працай на фабрыках і заводах, на сацыялістычных палёх нашай краіны.

Мы будуем сацыялізм за наш уласны, пралетарскі рахунак, перамагаючы труднасьці, таксама, як мы перамагалі Дзянікіна, Калчака і іх апякуноў-імпэрыялістаў цаною соцень тысяч герояў, загінуўшых на франтох і даўшых перамогу рабочай справе **(бурныя аплёдысмэнты).**

Мы ўкладваем мільярды рублёў. Але кожны разумее, што будоўля Магнітабудаў працягваецца некалькі год, паглынаючы сотні мільёнаў руб., а прадукцыю яны пачнуць даваць толькі праз два-тры гады. Магнітабуд ужо пачаў даваць з домны № 1 чыгун, ужо дабіўся перавышэньня праектнай магутнасьці гэтай домны, але поўным ходам увесь завод разгорнецца толькі праз год. У Днепрабуд мы ўжо пяць год укладваем буйныя капіталы, але яны толькі зараз пачнуць даваць рэзультаты.

Знойдуцца ныцікі, якія скажуць: «Калі справа такая цяжкая, укладваеце мільярды рублёў у заводы, якія дадуць прадукцыю толькі праз 2-3 гады, ці ня лепш палягчэй? Навошта вам адразу будаваць Магнітабуд гігантыцкі, буйнейшы ў сьвеце «Шарикоподшипник» у Маскве, Кузьнецкі мэталюргічны завод, Днепрабуд? Было-б прасьцей—не будаваць Магнітабудаў, а пабудаваць тэкстыльныя і абутковыя фабрыкі—быў-бы абутак, была-б мануфактура і г. д. Дзеля чаго трэба было праводзіць калектывізацыю, вялі-б сяляне па-ранейшаму аднаасобную гаспадарку. Даць-бы волю кулаку, кулак прывозіў-бы на рынак прадукты, іх купілі-б—жыць было-б лягчэй».

Так разважаюць дробна-буржуазныя капітулянты, заядлыя мяшчане, часамі з партыйным білетам, бо парт білет ад мяшчанства і ад дробна-буржуазных настрояў не выратоўвае, іншы беспартыйны часамі зьяўляецца больш стойкім і вытрыманым, чым другі партыец.

Але гэтыя «мудрацы» глыбока памыляюцца. Гэтыя людзі ня бачаць далей свайго посу. Яны не разумеюць аднаго асноўнага, таварышы. Яны не разумеюць таго, што калі-б мы пайшлі шляхам, які нам прапанавалі правыя ўхілісты і трацкісты, дык згубілі-б усё, што заваявалі ў Кастрычніцкую рэвалюцыю. Мы-б атрымалі ўзмацненьне не кулака, узмацненьне капіталіста, а гэта прывяло-б да аднаўленьня капіталізму, да аднаўленьня капіталістычнага рабства з яго жабрацтвам, голадам, беспрацоўем, бяспраўем.

Чаго варта краіна без мэталю, без машын, без магутнага індустрыяльнага пралетарыяту? Перад намі яркі прыклад—Кітай з яго 400-мільённым народам. Які-небудзь выхалашчаны, выхаваны ў буржуазных забабонах чалавек можа сказаць: «Ну, што-ж кітайскі народ адсталы». Няпраўда, гэта народ энэргічны са старой, шматвяковай культурай. Але гэта народ, які ня змог яшчэ стварыць сабе магутнай камуністычнай партыі, ня змог у большасьці рабіць (за выключэньнем савецкіх) разгарнуць як сьлед барацьбу за сваё вызваленьне ад унутраных і замежных капіталістаў, ня мае разьвітай індустрыі, ня мае свайго магутнага індустрыяльнага пралетарыяту. Хоць Кітай мае тэкстыльныя фабрыкі, але ён ня мае мэталю, ня мае машын і, значыць, ня мае неабходных сродкаў абароны. І таму кітайскі народ зьбіваюць, грабяць і гвалтуюць каму не лянота, пры падтрымальні кітайскіх генэралаў і капіталістаў.

Нам такі лёс не прыгатоўлен. Мы ведаем, што праз надзвычайныя труднасьці, перамагаючы іх, мы будуем завод за заводам. Мы маем свой мэталь, у гэтым годзе павінны будзем мець 10 млн. тон, а ў наступныя гады—новыя і новыя мільёны тон. Мы маем свае машыны, свае трактарныя заводы-гіганты, якія даюць нам каля 300 трактараў у дзень. Мы маем свой чыгун, сваю сталь і буйнейшыя машына-будаўнічыя заводы. Іх мала, але мы іх створым яшчэ больш **(бурныя аплёдысмэнты).** Нас зьнішчыць ку ніхто не засьцігне. Вольныя ад прыгнечаньня памешчыкаў і капіталістаў мы заўсёды гатовы грудзьмі абараняць сваю свабоду і незалежнасьць сваёй краіны, і гэта толькі таму, што наша рабочая кляса ідзе па верным шляху, па шляху разьвіцьця індустрыі, разьвіцьця калгасаў, ідзе пад кіраўніцтвам партыі, пад ЦК і лепшага правадніка ідэй Леніна—тав. Сталіна **(бурныя аплёдысмэнты).**

Чаго варта пралетарская краіна, якая дае магчымасьць у сябе пад бокам разьвівацца, расьці памешчыку, кулаку, гарадзкім капіталістам, якія-б націскалі на рабочую клясу і якія-б дыктавалі рабочай клясе свае ўмовы, якія-б грабілі рабочых і сялян і трымалі іх пад страхам голаду і беспрацоўя? Разважаньні аб тым, што кулак вывозіў-бы на рынак прадукты—пустая балбатня. Рабочы не атрымаў-бы гэтых прадуктаў, бо ў горадзе вырас-бы новы капіталіст—гандляр-камэрсант, у вёсцы—кулакі і поўпамешчыкі, а паша сіла была-б мізэрнай, нікчэмнай, асабліва ў галіне гаспадарчай, а гэта, як відома, вырашае пытаньне і аб палітычнай уладзе.

Гісторыя паставіла пытаньне: або Кастрычніцкая рэвалюцыя і барацьба за сацыялізм да канца, барацьба з усімі часовымі труднасьцямі, што стаяць на нашым зьвілістым і цяжкім шляху, або—назад да капіталізму.

Правыя і «левыя» ўхілісты паддаліся гнілым капітулянцкім настроям. Трацкісты сваімі «левымі» фразамі цягнулі нас да аднаўленьня капіталізму.

Мы, таварышы, пашлі па другім шляху. Мы пайшлі па ленінскім шляху, магчыма, на першы час больш цяжкім, але затое, па шляху ўпэўненым, па шляху цьвёрдым, адзіным шляху, які дае перамогу. Добрыя былі-б камандзіры, добрыя былі-б байцы, чырвонаармейцы, калі-б, заваяваўшы пазыцыі, заваяваўшы адну гару, яны-б раскісьлі, размагнэсаваліся, палегалі-б спаць, зьнялі-б дазоры, пусьцілі-б коняй пасьвіцца і сказалі-б: «Ну, браткі, адпачынак. Далей—балота, далей—шлях праз калючкі, далей трэба ўчынімацца на новую гару, браць новую сопку,—мы змарыліся, лепш пакуль тут пасьпімо».

Так скажам сабе і ўсяму савецкаму пралетарыяту: ня здымаць дазораў, не дэмабілізоўвацца, а стаяць на пасту, ня спыняцца на адным пазыцыі, а ісьці наперад (бурныя аплёдысмэнты).

Мы гаворым сумленна і проста рабочым: «Ты, пралетары, змагар за справу сацыялізму, ты, прайшоўшы крывавы шлях барацьбы, цяжкі шлях ад заваяваньня ўлады пралетарыятам у Кастрычніку 1917 году, абароны гэтай савецкай улады ў грамадзянскую вайну, праз нэп, праз абыходны шлях да сацыялізму,—ты ведаеш, што мы прыйшлі зараз да рэканструкцыйнага пэрыяду, мы прайшлі праз шлях барацьбы і боек з кулаком за хлеб, мы сёньня перажываем яшчэ труднасьці, але ня нам, бальшавікам, ня нашаму рабочаму Вялікага Савецкага саюзу адступаць, ня нам пасаваць падобна правым і «левым» капітулянтам перад часовымі шпарка праходзячымі затрудненьнямі. Няхай тыя, хто баіцца і дрэйфіць перад гэтымі труднасьцямі, тыя, хто гатоў за чачавічную пахіббку прадаць нашы перамогі, якія мы заваявалі,—няхай яны мараць аб шляхох здачы заваяваных пазыцый. А наша шматмільённая рабочая кляса, што кіруецца партыяй, кіруецца ня трэд'юніяністкімі, а перадавымі бальшавіцкімі прафсаюзамі, адкіне прэч малаверaў і будзе бадзёра і ўпэўнена ісьці наперад, праз труднасьці—да новых перамог. **(Бурныя аплёдысмэнты, пераходзячыя ў авацыю).**

Аб'яднаньні лёгкай прамысловасьці зацягваюць складаньне плянаў другой пяцігодкі

Калегія НК лёгкай прамысловасьці ў адпаведнасьці з аспоўнымі дырэктывамі ЦК КП(б)Б і СНК БССР дала канкрэтныя ўказаньні аб'яднаньням лёгкай прамысловасьці аб складаньні да 1 чэрвеня плянаў другой пяцігодкі і прадстаўленьні іх у Дзяржплян.

Але павольныя тэмпы выканаьня прапаноў калегіі пагражаюць скарачэньню работ у тэрмін.

Паводле заданьня Наркамлёгпраму, да 20 мая камісія па складаньні другой пяцігодкі павінна была разглядзець варыянты пяцігодкі па ўсіх аб'яднаньнях. Гэту работу да вызначанага тэрміну выканала толькі Шкловаб'яднаньне, якое мабілізавала ўсе сілы і сур'ёзна падыйшло да справы. Скураб'яднаньне прапрацавала першы варыянт пяцігодкі, але ў апошні час значна аслабіла тэмпы работы і не прадставіла плян у тэрмін.

У пляне другой пяцігодкі БССР вялікая ўвага аддаецца разгортваньню ільна і пенькаапрацоўчай прамысловасьці і папярэньню вытворчасьці трыкатажу. Амаль палова ўсіх кап

ГОЛАД У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ—ВЫНІК ПАЛІТЫКІ АКУПАНТАЎ

У Валожынскім павеце памерла 20 сялян

ВІЛЬНЯ, 22. Эпідэмія тыфусу набывае страшэнныя размеры. Голад, якім акупаваны вёскі Заходняй Беларусі, стварыў спрыяючы грунт для шаляючай эпідэміі.

Ня гледзячы на тое, што высланы для абмежаваньня заражоных раёнаў спэцыяльныя санітарныя атрады, — **эпідэмія тыфусу перакінулася ў рад новых мясцовасьцяй.**

Эпідэмія з асаблівай сілай выбухнула пачала **ў Валожынскім павеце. Паводле даных «КУР'ЕРА ВІЛЕНСКАГА», там хварэе тыфусам звыш 150 чалавек. Ужо 20 сялян памерла.**

Эпідэмія лютуе таксама на тэрыторыі **Маладэчанскага, Дзісьненскага, Сьвянцянскага, Браслаўскага і Ашмянскага паветаў.** Сапраўдныя размеры эпідэміі і лік памёршых буржуазная преса **ўтойвае.** Преса таксама абыходзіць маўчаньнем **прычыны** эпідэміі.

Ня гледзячы на ўсю сур'ёзнасьць становішча, фашысцкі ўрад ня прымае ніякіх мер дапамогі. Галодныя сяляне кінуты на волю лёсу.

Падсудныя выкрываюць злачынствы турэмных катаў

ВІЛЬНЯ, 22. У Віленскім акруговым судзе адбываўся па днях адзін са шматлікіх палітычных працэсаў. Палітычныя працэсы — штодзённае зьяўішча ў Польшчы і асабліва на акупаваных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, дзе белы тэрор **асабліва** абвостран.

Як паведамляе **«Слова»**, на гэты раз суд разглядаў справу «небясьпечнай камуністычнай ячэйкі, якая дзейнічала на тэрыторыі Сьвянцянскага, Браслаўскага, Пастаўскага і Дзісьненскага паветаў. На лаве падсудных апынулася аж восем небясьпечных антыдэяржаўнікаў».

У часе ходу працэсу падсудныя востра запратэставалі супроць барбарскага абыходжаньня з імі з боку турэмнай адміністрацыі. Выявілася, што сёлета 1 мая палітычныя вязьні **Лукішак** адзначылі **магутнай дэманстрацыяй і пяньнем рэвалюцыйных песень.** Дэманструючых палоньнікаў-рэвалюцыянэраў турэмныя каты, паводле загаду начальніка, **зьбілі, кінуўшы на доўгі час у карцар.**

Гэты «інцыдэнт» на працэсе тым больш характэрны і цікавы, што тое-ж «Слова» ў нумары за 3-V пісала: «1 мая на Лукішках камуністы не рабілі ніякіх спроб дэманстраваць».

На падставе прыгавару віленскага акруговага суда трое абвінавачаных **—Гольдбэрг, Лясковуі Цэйтэлева** кінуты ва кратыцна 8 год кожны, **Левін—** на **6 год, Гарданова — на 4** гады і **Додзлеў** — на **1** год. Абвінавачаныя **Баран і Лясковая** з прычыны абсалютнай адсутнасьці доказаў віны — апраўданы.

Яшчэ адна ахвяра фашысцкага тэрору

ВІЛЬНЯ, 22. Баранавіцкая турма, «аслаўленая» ня так даўно тым, што ў яе мурох былі павешаны сем беларускіх рабочых - чыгуначнікаў, была пазаўчора зноў сьведкай расправы азьвярэлых акупантаў.

Наваргрудзі ваенны палявы суд на выязной сэсіі ў **Баранавічах** разглядаў справу двох братоў — **Міколы і Габруся Чыгіраў,** сялян **Стаўпецкага** павету.

Абвінавачаньне — модны сёньня ў акупанцкіх судох «шпіянаж». Прыгавор суда бывае ў такіх справах адзін — **на шыбеніцу.** Так было і цяпер. Пасьля сухіх, шаблённых цэрамоній быў вынесен прысуд: **сьмерць праз павешаньне абодвым братом,** ня гледзячы на тое, што маладзейшаму з іх — **Габрусю — ледзь мінула 19 год.**

20 мая прыехаў памочнік галоўнага штатнага ката Мацэеўскага — **кат Браун.** У сутарэньні Баранавіцкай турмы вырасла яшчэ адна шыбеніца. На ёй павіс Мікола Чыгір.

19-гадовага Габруся прэзыдэнт рэспублікі «памілаваў»... **на вечную катаргу.**

Прадстаўнікі ангельскіх ваенных заводаў прыбылі ў Рыгу

РЫГА, 19. У Рыгу прыехалі прадстаўнікі ангельскіх ваенных заводаў «Вікерс-Амстронг» генэрал Бэрч і палкоўнік Брыдж.

АДКРЫЎСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ

Увечары 20 мая распачаў сваю работу 3-ці зьезд т-ва Чырвонага крыжу і Чырвонага паўмесяца БССР. Зьезд адкрыў старшыня ЦК таварыства **тав. Хацкевіч.**

Зьезд выбраў прэзыдыум з 45 асоб, сакратарыят і мандатную камісію. **У ганаровы прэзыдыум выбрана Палітбюро ЦК УсеКП(б), т. т. Тэльман, Крупская, Гікало, Шаранговіч, Галадзед, Чарвякоў, Убарзвіч, Калнін і Рыжоў.**

На вячэрнім пасяджэньні зьезд заслухаў прывітаньні ад Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму, ЦК ЛКСМБ, вайскова - санітарнай службы БВА, а таксама рапарты і прывітаньні ад чырвонаармейцаў, ад заводу імя Варашылава, абутковай фабрыкі, санітарна-вуэбнага корпусу мэдінстытуту, курсаў мэдсясьцёр і піянэр-арганізацыі.

***

21 мая зьезд заслухаў справаздачны даклад тав. Хацкевіча і судаклад рэўкамісіі. На працягу ўсяго дня і раніцішнім пасяджэньні 22 мая адбываліся спрэчкі па справаздачы ЦК Чырвонага крыжу. З прывітаньнем ад ЦК КП(б)Б выступіў **тав. Гаруновіч.**

Сваячасова выдаваць новыя падручнікі

Цэлы рад фактаў гаворыць аб тым, што ня ўсе арганізацыі па-баявому ўключаюцца ў падрыхтоўку да новага навучальнага году. Напрыклад, зусім дрэнна стаіць справа з выданьнем новых падручнікаў. Рабочыя друкарні імя Сталіна, азнаёміўшыся з гэтым пытаньнем, у адкрытым лісьце да Наркамасьветы і ДВБ пішуць, што:

«Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі злачынна мала клапоціцца аб выданьні новых падручнікаў для школ і ВНУ. З 90-100 назваў, якія павінны быць выданы (агульнай колькасьцю 7 млн. экзэмпляраў), сёньня паступіла ў друкарню толькі два падручнікі — **Брохес, фізыка,** 1 ч. і чытанка **Какардзіноўскай і Рыжыкавай «Шлях барацьбы і перамог».**

А калі астатнія 98 падручнікаў будуць зданы ў друк, нават само ДВБ ня ведае.

Тав. **Некрашэвіч,** загадчык выдавецтва, адказаў нашай рабочай брыгадзе, што праз месяц-два друкарня будзе завалена заказамі ў такім разьмеры, што прыдзецца вышэваць яшчэ адну ратацыйную машыну.

А сёньня кніжная ратацыя і стэрэатыпны цэх працуюць у адну зьмену, бо няма работы.

ДВБ супакойвае тым, што «праз месяц-два друкарня будзе завалена работай». Але-ж тады застанецца **ЗУСІМ МАЛА** часу да пачатку навучальнага году і друкарня ня зможа выпусьціць 7 млн. экзэмпляраў кніжак.

Таму мы, рабочыя друкарні імя Сталіна, зьвяртаемся да рабочай і савецкай грамадзкасьці з заклікам ўключыцца ў актыўную падрыхтоўку да новага навучальнага году, дапамагчы ліквідаваць прарыў па выданьні падручнікаў.

Наркамасьветы-ж БССР і Дзяржаўнаму Выдавецтву Беларусі прад'яўляем рахунак за зрыў выкананьня прамфінпляну кніжнай ратацыі, стэрэатыпнага цэху і ўсёй друкарні.

Друкарскі цэх і ўся друкарня імя Сталіна гатовы сваячасова надрукаваць падручнікі для нашых школ. Трэба толькі, каб Наркамасьветы і ДВБ не чакалі апошніх дзён, а зараз-жа здалі нам рукапісы ў вытворчасьць.

(Па даручэньні рабочых друкарскага цэху: загадчык цэху **Слоўшч,** сакратар парт'ячэйкі **Крэйнін,** прафцохкамітэт **Рубін М.**

Пуск чацьвертай коксавой батарэі на Днепрапятроўскім заводзе

ДНЕПРАПЯТРОЎСК. Пасьля выпрабаваньня і дэтальнай праверкі мэханізмаў 19 мая ў 11 гадзін раніцы пачата загрузка шахты ў чацьвертай батарэі Днепрапятроўскага коксазаводу. 20 мая ў 13 гадзін выдана першы шар (партыя коксу), аналіз якога даў вельмі здавальняючыя вынікі.

Пуск чацьвертай батарэі коксавых печак без дапамогі замежных спэцыялістаў сьведчыць аб тым, што інжынэрна-тэхнічны пэрсанал авладаў тэхнікай пуску коксавых агрэгатаў.

З увядзеньнем у строй чацьвертай батарэі прадукцыйнасьць Днепрапятроўскага коксазаводу павялічваецца на 25 проц.

Распрацоўка руды Курскай магнітнай анамаліі

ЛЕНІНГРАД. «Гипроруда» прыступіла да праектаваньня першай групы для распрацовак жалезнай руды ў раёне Курскай магнітнай анамаліі. Руда буде знаходзіцца на Жарагацкім участку анамаліі каля горада Стары Оскал. Здабына руды будзе мэханізавана. Гадавая прадукцыя распрацовак Курскай анамаліі складае 3 мільёны тон жалезнай руды.

Нафтавы фантан на промыслах Грузнафты

ТЫФЛІС. На Мірзанскім промысьле Грузнафты з адной буравой на глыбіні 453 мэтраў ударыў нафтавы фантан вышынёй у 7 мэтр. Фантан біў 8 мінут і выкінуў 25 тон нафты. Шчыльна поўна чыстай нафты і газу.

Коксавы завод у Туапсэ

НОВАРАСІЙСК. У Туапсэ закончана пабудова другога ў Саюзе коксавага заводу па выробу з нафты бязволнітага коксу. Атрыманыя першыя партыі коксу — высокай якасьці.

Алюмініевы камбінат набірае тэмпы

ВОЛХАЎБУД. Волхаўскі алюмініевы камбінат з кожным днём павышае выплаўку алюмінія. 17 мая з 12 ваннаў здабыта 9.945 кгр. алюмінія. Усе ванны працавалі ў разьмеры праектнай магутнасьці. Тэта вялікая перамога забясьпечнае выкананьне праграмы. Ванна № 50 дала 460 кгр. за мест нормы 400 кгр.

Павышаецца таксама якасьць алюмінія. Ванна № 54 дала плаўку з палучаснасьцю алюмінія 99,8 проц., што прыбліжае алюміній да першага гатунку.

Здабыча торфу па заводах Белторфаб'яднаньня

16 мая	Дзеннае заданьне--4557	Проц. выкан.
	Здабыта 2169,7	39,5

Вынікі здабычы па асобных заводах характарызуюцца наступнымі лічбамі:

«Свабода»—192,9 тоны, або 72,5 проц. дзеннага заданьня, завод імя Даўмана—167,9 тоны—71,3 проц. пляну, «Закрашынскі мох» — 102,2 тоны—47,8 проц., «Чырвоная Беларусь»—217,7 тоны—47,4 проц., «Шлях сацыялізму»—500,1 тоны — 35,7 проц., «Бальшавік»—315,8 тоны—31,1 проц., «1-га мая»—96,1 тоны—26,7 проц., Асінторф — 445 тон—21,4 проц., «Чырвоны сьцяг» — 90 тон—15,5 проц., «Смалявічы»—55 тон — 10,6 проц.

Сельгасмашыны

Завод «Гомсельмаш» 17 мая выпусьціў 41 сілясарэзку, што складае **124 проц.** сутачнага заданьня, 5 канюшынасартоўак — **125 проц.** і 21 сячкарню — **113 проц.**

За 19 мая выпушчана 41 сілясарэзка — **124 проц.** сутачнага заданьня, 21 сячкарня — **113 проц.** і 4 канюшынасартоўкі — **100 проц.**

Будматар'ялы

За 18 мая па заводзе **«Чырвоны Кастрычнік»** выраблена 1.640 кгр. будаўнічых цьвікоў, што складае ўсяго 23,8 проц. сутачнага заданьня.

***

Заводам «Інтэрнацыянал» за 16 і 17 мая выпушчана 1726,5 кгр. шрубаў, што складае **97,5 проц.** пляну.

***

Дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн» за 19 мая расьпілаваў 166,3 куб. сыроцу, што складае 80 проц. заданьня.

Папера

Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» за 16, 17 і 18 мая **зноў недадала краіне 112 тон паперы.** Выраблена паперы ўсяго 132,2 тоны замест прадугледжаных планам 244,2 тоны, што складае 54,1 проц. заданьня.

Саломенай цэлюлёзы выраблена 31 тона — 86,3 проц. Прастой машыны — 123 гадзіны, замест прадугледжаных планам 27 гадз.

***

Папяровая фабрыка «Спартак» павялічвае тэмпы выпрацоўкі. Так, за 15 мая сутачнае заданьне было выканана на 84,3 проц., 17 мая — на 87,9 проц., а 18 мая — на 91,7 проц. (выраблена 15,9 тоны паперы). Прастой машыны за 18 мая — 5 гадзін.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» 17 мая выпусьціла 4.664 пары абутку, што складае 143,9 проц. сутачнага заданьня. Абутку хлапчуковага (яловага) выпушчана 2.209 пар — 420,7 проц., боты — 1.906 пар — 178,9 проц., абутку хлапчуковага (выраткоўкага) 323 пары — 56,1 проц. і абутку жаночынскага 226 пар — 21 проц.

Былыя чырвоныя камандзіры і партызаны Кубані выкрываюць Гаргулава

Як відаць, ініцыятары брудной антысавецкай выдумкі аб «необальшавізьме» Гаргулава разьлічвалі на тое, што нікога са сьведкаў крывавых злачынстваў гэтага бандыта не засталося ў живых.

Гэй, каты Гаргулавы, Астахавы, Шкуро, Энгельгарды і інш., яшчэ не пасьпеўшая падохнуць у чужым краі контрэвалюцыйная сволач! Слухайце! Гаворыць чырвоны камандзір, намётушыя вам капісьці банд на Кубані і Цераку. Гаворыць людзі, якія будуюць новае сацыялістычнае грамадзтва. Мы яшчэ живы і мы яшчэ добра памятаем вашу вграю. Давайце пагаворым пра старае адкрыта, па душах.

Андрэй Шкуро! Ты добра памятаеш сына крамольніка Еўдакіма Дравяньнікова, твайго суседа па станіцы Пашкоўскай? Ён цягаў цябе з дзяцінства за вушы, як шчанё, а ў рэвалюцыйных баёх біў, як дарослага сабаку. Дык вось памятаеш, Шкуро, як папаліся нам у палон нашы апушныя знаёмыя, станічнікі са станіцы Пашкоўскай: пад'есаул Лапека, Лейнэга і інш? Дык вось на допыце ў штабе яны прызнаі, што сярод белага начальніцкага і адміністрацыйнага складу быў ГАРГУЛАЎ, да адукацыі фэльчар, а па спэцыяльнасьці ЗАЯДЛЫ КРЫМІНАЛЬНЫ БАНДЫТ І ГАДАВАРЭЗ.

Гаргулаў, карыстаючыся сваімі знамітасьцямі ў станіцах, як «шкарь», мабілізоўваў насельніцтва вакольных станіц на барацьбу з бальшавікамі. Ён таксама працаваў у якасьці інтэндантаа-ўпражыра, здабываючы харчы для белых банд. У вольны-ж ад простых абавязкаў час ён з шайкай прабежнікаў, падобных да сябе, рабаваў куфры і займаўся лупцаваньнем мірных жыхароў, прычым, як пацьвярджае чырвоны камандзір тав. ПЯТРЭНКА (успаміны якога цалкам супадаюць з успамінамі камісара Федэіна), банда Гаргулава ня толькі РАБАВАЛА І ЗАБІВАЛА ні ў чым не вінаватых і безабаронных жыхароў, але як шайка заўзятых прафэсыянальных садыстаў, па - зьверску ГВАЛТАВАЛА ЖАНЧЫН.

На зьезьдзе ў Майкопе з сьнежня 1917 году, скліканым генэралам Данілавым і палкоўнікам Іваненка, Гаргулаў выступаў у якасьці «упаўнаважанага ад ваенных фронтовых арганізацый». Падамо наступныя словы з яго пагромнай прамовы: «Казакі, сьцісьніце мацней вінтоўкі ў сваіх руках, бо недалёк час, калі іншагародны (сялянскі) плуг будзе бараздзіць вашу казацкую зямлю». ЁН ЗАКЛІКАЎ ДА ПАГРОМУ ІНШАГАРОДНЯЙ СЯЛЯНСКАЙ БЕДНАТЫ.

Гаргулаў, карыстаючыся мэдыцынскімі дакумантамі, прыяжджаў у Беларускую станіцу перад адступленьнем чырвоных на Паскі. Ім быў з'арганізаваны камандзір конной сотні, здраднік БЕДЗІНАЎ, які перайшоў на бок белых.

Можна прывесьці яшчэ рад аналягічных фактаў, але даволі і гэтых, каб усяму сьвету стала вядома: Гаргулаў, які страляў у прэзыдэнта Францыі, — гэта белабандыт, прафэсыянальны грабежнік, гвалтаўнік і кат са станіцы Лабінскай.

Цяпер коратка аб ЗАЛАТАРОВЕ, якога царыская ахранка прабавала прадставіць «савецкім камісарам». Мы поўнасьцю пацьвярджаем факт, што такая асоба была. Гэта быў АКТЫЎНЫ БЕЛАБАНДЫТ, які прымаў удзел у баёх супроць атрадаў т. т. Якаўлева і Бушко-Жука. Ён быў злоўлен атрадам апошняга і расстрэлян у Краснадары (б. Кацярынадар).

Цяпер аб «сьведку» францускай ахранкі — ІВАНЕ АСТАХАВЕ.

Здароўя жадаем, Іванушка Астахаў! Кланяецца табе Беларуская станіца. Здарова, гаворыць, Іудушка, здарова! Б'е вам чалом былы шынок Аніжава, у якім ты беспрассыпка п'янстваваў тыднямі, прапіваючы нарабаваны непрацоўны капітал. Кланяецца табе і былы ТЭАТР-КІНО БРАТОЎ АСТАХАВЫХ. Там зараз — ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ, які абслугоўвае культурныя патрэбы калгаснага насельніцтва. Шыльда астахаўская з яго даўно сарвана. Асірацела і нязграбна тырчыць напоўразбураная цагляная махіна твайго былога дому на базары.

Памятае вас, белабандытаў, усё кубанскае калгаснае сялянства і шкадуе, што не забіла вас, гадаў, каб раз назаўсёды адвучыць ад антысавецкіх правакацый.

(Па даручэньні групы таварышоў чырвоных камандзіраў і партызан Кубані і Цераку:

Былы старшыня беларэчанскага паравазнёвага

ВАСІЛЬ ДРАВЯНІКАЎ.

Камандзір чырвонагвардзейскіх і партызанскіх дружын у Майкопскім аддзеле

МІХАІЛ КУМШАЕЎ.

Вэрсія аб Залатарове праваліпася

ПАРЫЖ, 19. Агенцтва Гавас паведамляе: «Судовы доктар заявіў, **што ў Гаргулава няма на руцэ ніводнага шраму.** Гэта заява зьнішчае паказаньні сьведкі Астахава, які заявіў, што Гаргулаў у сапраўднасьці зьяўляецца Залатаровым і мае шрамы на руцэ».

Францускі генштаб--вярхоўны кіраўнік антысавецкага фронту

БЭРЛІН, 20. Левая «ВЕЛЬТ АМ АБЭНД» далей робіць выкрыцьці аб падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага саюзу. Паводле паведамленьня газэты з Белграду, там зараз адбываецца вайная канфэрэнцыя прадстаўнікоў генэральных штабаў краін Малой Антанты. Канфэрэнцыя павінна была адбыцца ў пачатку мая, але з прычыны абвастрэньня палітычнага становішча яна была адтэрмінавана.

Газэта піша: «Работа канфэрэнцыі адбываецца ў асобных камісіях паасобных генэральных штабаў. Гэтыя асобныя камісіі маюць на мэце практычна распрацаваць існуючыя ваенныя саюзы і ўрэгуляваць у выпадку вайны з СССР расстаноўку сіл краін Малой Антанты на розных участках фронту.

Як вядома, такая-ж тайная канфэрэнцыя прадстаўнікоў генэральных штабаў краін Малой Антанты адбылася 21-23 сакавіка ў ПРАЗЕ. Пасьля прасканфэрэнцыі 9-10 мая такая-ж канфэрэнцыя адбылася ў БУХАРЭСЬЦЕ. У канцы мая гэта серыя канфэрэнцый скончыцца канфэрэнцыяй У ВАРШАВЕ, дзе адначасова будзе адбывацца канфэрэнцыя прыбальтыцкіх краін і Польшчы. На ёй павінен быць падпісан ДАГАВОР ПАМІЖ ЛАТВІЯЙ, ЭСТОНІЯЙ І ПОЛЬШЧАЙ АБ ВАЕННЫМ САЮЗЕ. НА ВАРШАЎСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ БУДЗЕ ТАКСАМА ПРЫСУТНІЧАЦЬ ВЯЛІКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ФРАНЦУСКАГА ГЕНЭРАЛЬНАГА ШТАБУ, А ТАКСАМА ФІНЛЯНДСКІЯ ВАЕННЫЯ АТАШЭ Ў ПРЫБАЛЬТЫЦКІХ КРАІНАХ.

ВЯРХОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА ЎСІМІ ГЭТЫМІ КАНФЭРЭНЦЫЯМІ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕЦЦА ФРАНЦУСКІМ ГЕНЭРАЛЬНЫМ ШТАБАМ, ПРАДСТАЎНІКІ ЯКОГА ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА СТАРШЫНЯМІ ЎСІХ ГЭТЫХ КАНФЭРЭНЦЫЙ».

СССР застаецца на цьвёрдай пазыцыі няўмешваньня

Камісія лёрда Літона ў Харбіне вьярнулася праз савецкага генэральнага консула ў Харбіне тав. Славуцкага да савецкага ўраду з просьбай дазволіць групе членаў камісіі **праезд праз Благавешчанск у Сахалян для сустрэчы з генэралам Ма.** Савецкі ўрад даручыў тав. Славуцкаму адказаць камісіі Літо нацый, што ён, не жадаючы парушаць прынцып няўмешваньня ва ўнутраныя справы Манчжурыі, прымушан адхіліць просьбу членаў камісіі Літона.

40 чалавек савецкага экіпажу вырашылі праблему харчаваньня 500 чалавек

ПАРЫЖ, 21. Карэспандэнт газэты «Пці Парызьен», апісваючы пагібель параходу «Жорж Філіпар», піша: «Рускія маракі параходу «Савецкая гафта» падзяліліся ўсім, што мелі, з пасажырамі параходу, якія засталіся живымі. Доктар Гіб'е тэлеграфуе, што **40 чалавек савецкага экіпажу вырашылі праблему харчаваньня 500 чалавек,** якія пацярпелі ад караблякрушэньня. Жанчыны і дзеці былі разьмешчаны ў каютах камандзнага складу»

Адкрыўся першы кангрэс інтэрнацыяналу партавікоў

БЭРЛІН, 21. У Альтоне ля Гамбургу сёньня адкрыўся першы кангрэс адзінства інтэрнацыяналу партавікоў. На кангрэс прыбылі дэлегаты з 27 краін. Маракі і партавікі Канады і Аўстраліі прыслалі кангрэсу прывітальныя тэлеграмы. З прывітаньнямі на кангрэсе выступалі таксама дэлегаты буйных прадпрыемстваў з Гамбургу, транспартных рабочых, чыгуначнікаў, партавікоў, трамвайных служачых і г. д. Кангрэс адкрыў вялікай прамовай сакратар Інтэрнацыяналу маракоў і партавікоў Вальтэр. Тав. Вальтэр падкрэсьліў, што ўпершыню ў гісторыі маракі і партавікі зьбіраюцца на свой міжнародны кангрэс.

На парадку дня кангрэсу стаяць наступныя пытаньні: **1) Крызіс капіталізму і становішча маракоў-партавікоў і воднікаў і стварэньне адзінага міжнароднага фронту барацьбы рабочых воднага транспарту; 2) Барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны; 3) Арганізацыя баёў рабочых воднага транспарту ў калёніяльных краінах.**

(ТАСС).

Плян замаху на прэм'ера Інукайя распрацоўваўся трыма арганізацыямі

ТОКІО, 20. Агенцтва Сімбун Рэнта падае, што паліцыя прафэктуры Ісаракі канкрэтна ўстанавіла паяўпасьць сувязі паміж **«Лігай кроўнага брацтва», «арганізацыяй маладых афіцэраў»** і групай **«сьмяротнікаў-сялян»** — арганізацый сялянскай моладзі, якой кіруе пейкі **Тацыбан.** Устаноўлена, што плян замаху 15 мая, уключаючы замах на электрасьтэму, **распрацоўваўся супольна трыма арганізацыямі.** Меркавалася, што пасьля таго, як будзе спынена падача сьвятла, удзельнікі замаху, карыстаючыся цемнатой, зробяць рад забойстваў, у першую чаргу міністраў і другіх палітычных і фінансавых дзеячоў. Апошняя сустрэча кіраўнікоў паказаных арганізацый адбылася 30 мая для раздачы бомб, выбуховых матэрый і грошай у суме 2.000 іен. Як падае агенцтва, паліцыя **мяркуе арыштаваць 300 членаў «Лігі кроўнага брацтва», 120 членаў «арганізацыі маладых афіцэраў» і 300 прыхільнікаў Тацыбана.** Даныя паліцыі абгрунтаваны на паказаньнях кіраўніка пашкоджаньняў электрасьтэмы, які добраахвотна зьявіўся 18 мая ў жандарскае кіраўніцтва ў Мацуі, у прафэктуры Сіманэ.

ЗАБАСТОЎКА ПАШТОВА-ТЭЛЕГРАФНЫХ СЛУЖАЧЫХ У ГРЭЦЫІ

Прэм'ер-міністар пагражае бастуючым крывавай расправай

АФІНЫ, 21. Прэм'ер-міністар Грэцыі Вэнізэлёс у парламенце заявіў, што калі забастоўка служачых пошты, тэлеграфу і тэлефону ператорыцца ва ўсеагульную забастоўку, ён будзе лічыць такавую рэвалюцыйным выступленьнем, а краіну ў стане «вайны», бо грамадзянская вайна роўназначна ўсякай другой вайне. Вэнізэлёс сьцьвярджае, што ўраду лёгка будзе задушыць паўстаньне. Да бастуючых служачых пошты, тэлеграфу і тэлефону ўчора далучыліся служачыя дзяржаўнага кантролю, фінансавай сэкцыі і мытныя шляўнікі. Масавая дэманстрацыя, якая адбылася ў Афінах пад кіраўніцтвам кампартыі, прайшла з вялікарным уздымам.

У барацьбе за якасьць дрожджаў

Аднэй з асноўных прычын невыкананьня прамфінпляну ДРАЖДЖАВОГА ЗАВОДУ «ЧЫРВОНАЯ ЗАРА» на працягу раду месяцаў зьяўляўся нізкі выход дрожджаў. Калі ў першай палове 1931 году сярэдні выход дрожджаў з адзінкі сыроцу (мэлясы) складаў 67,5 проц., дык у другой палове 1931 г. выхад рэзка зьнізіўся (ліпень—62,5 проц., жнівень — 55,5 проц., верасень — 62,4 проц., кастрычнік — 52,9 проц., лістапад — 43,5 проц. і сьнежань—45,3 проц.).

Першы квартал 1932 году ня даў амаль ніякага перапому. Сярэдні выхад дрожджаў у студзені складаў 50,3 проц., у лютым — 48,6 проц., у сакавіку — 48,9 проц.

Каб павялічыць выхад дрожджаў, на заводзе быў пастаўлен цэлы рад вольных работ па вывучэньні якасьці паасобных відаў сыроцу. У выніку вольнатаў удалося ўзьняць выхад дрожджаў да 75 проц.

Якасьць дрожджаў заводу «Чырвоная зара» — на належнай вышыні. Згодна ўсесаюзнаму стандарту, дрожджы першага гатунку павінны мець пад'ёмную сілу ня вышэй 100 мінут, захаванасьць пры тэмпэратуры ў 30 градусаў ня ніжэй 48 гадзін.

Дрожджы заводу «Чырвоная зара» — вышэй стандарту — у красавіку г. г. іх пад'ёмная сіла складала 56 мінут, а захаванасьць — 54 гадзіны.

Вялікая ўвага аддаецца на заводзе пытаньням барацьбы са стратамі. Наладжан кантроль у асноўных цэхах заводу — заторным, сэпаратарным і перасоевічным аддзяленьнях. У заторным аддзяленьні страты складалі раней 5 проц. Дзякуючы устаноўленьню кантролю і ўзьдзеньню абавязковай прамыўкі адыходаў ад кожнага затору, страты зьніжаны да мінімуму. У сэпаратарным аддзяленьні, дзе страты складалі раней каля 1 проц. дрожджаў, устаноўлен лябараторны кантроль, які вызначае страты па кожнай зьмене ў паасобку. Аднак, лябараторыя абслугоўвае добра толькі першую зьмену, а вынікі работы другой і трэцяй зьмены яна выяўляе толькі на другі дзень. Адміністрацыя заводу павінна ўстанавіць пастаянны лябараторны кантроль для другой і трэцяй зьмен.

Значна дапамагло паляпшэньню якасьці работы ўвядзеньне гаспадарчага разрахунку.

Добры прыклад ударнай барацьбы за якасьць работы паказала брыгада качагараў т. КАЦЬКО, даўшая ў першым квартале г. г. эканоміі апалу звыш пляну 13 проц. па дражджавым заводзе і 9 проц. — па патачным.

На патачным заводзе рэалізован рад рабочых прапаноў па барацьбе са стратамі. Напрыклад, на косьцявугальнай станцыі заводу, дзе раней разам з водой унасілася і патака, зараз ужываецца рацыяналізатарская прапанова рабочага-выдумшчыка т. КАЛАНІЦКАГА, якая дала магчымасьць зусім ліквідаваць страты.

На заводзе працуюць тры тэхнічныя гурткі — па дражджавой, патачнай і мэханічнай справе.

Удзельнікі «Зьвязды»: ГАЛЬДШТЭЙН, ВІТОЛІН, БРЭГЕР, ЗЛЬКІН, САРОКІНА і СМЕЛЬКІНСОН.

Паведамленьні

— Арганізацыйна - інструктарскі аддзел ЦК КП(б)Б прапануе тав. Белазерову, б. члену Магілеўскай райпартарганізацыі, перакінутаму для партработы ў Лепельскі раён, зьявіцца ў ЦК КП(б)Б.

— Менская партызанская камісія паведамляе, што чырвоныя партызаны і чырвонагвардзейцы, якія не прайшлі чыстку, павінны зьявіцца ў камісію гарсавету, пакой 24 для рэгістрацыі не пазьней 30-V—32 г. Пасьля пакаванага терміну партызанскія дакументы будуць лічыцца несапраўднымі. Усім жакстам і вагонаважатым трамваю звяртаецца увагу на штамп камісіі, які накладваецца на кніжцы пры прахаджэньні чысткі. Без гэтага штампу вагонаважатым прапануецца адбіраць білеты чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў і накіроўваць у партызанскую камісію, а жакстам — пазбавіць камунальных ільгот.

Сакратар партызанскай камісіі ФІЛЬЧАНКА.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

СЁНЬНЯ, у 7 гадз. вечара, у **Доме Камасьветы** (былы клюб К. Маркса)
Дзяржарбітраж пры СНК з удзелам грамадзкасьці
БУДЗЕ ПРАЦЯГВАЦЦА РАЗГЛЯД СПРЭЧАК
ПАМІЖ ВЫДАВЕЦТВАМІ **„Зьвязда", „Савецкая Беларусь",**
ДВБ І Саюздрукам ПРЫ НК СУВЯЗІ
аб недахопах у распаўсюджаньні і дастаўцы газэт і часопісяй.
Запрашаюцца шырокія колы работнікаў сувязі, выдавецтваў, рэдакцый, упаўнаважаных па друку на прадпрыемствах, кантрольных пастах, рабкоры і чытачы газэт і часопісяй. **Уваход вольны.**
Дзяржарбітраж пры СНК.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на ЧЭРВЕНЬ і да канца году
на газэту
„ЗЬВЯЗДА"
ОРГАН ЦК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 мес.—1 руб. 3 мес.—3 руб. | 6 мес.— 6 руб. 12 мес.—12 руб.
ПАДПІСАЦЦА МОЖНА: на пошце, у лістаносца, у ўпаўнаважаных друку на прадпрыемствах, у калгасах, у кіёсках СЛЮЗДРУКУ
па 23 ЧЫСЛО КОЖНАГА МЕСЯЦА.
Не прапускайце апошняга тэрміну падпіскі, бо інакш падпіска будзе перанесена на наступны месяц.
Каб ня было перабою ў дастаўцы газэты, падпісвайцеся на больш доўгі тэрмін—на год ці паўгода.
Абавязкова захоўвайце квітві аб падпісцы.
Калі вы, падпісаўшыся, не атрымліваеце газэты, зьвярнецеся ў гую паштовую ўстанову, якая павінна вам не дастаўляць.
Калі на мясцовай пошце нельга дабіцца здавальняючага вынікі, перашлеце скаргу ў кантору рэдакцыі (Менск, Савецкая 63, выдавецтва „Зьвязда").

Кіно **„Інтэрнацыянал"** — *СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА* **Ната Вачнадзэ** ў мастацкім бытавым фільме вытворчасьці Украінфільм **Кварталы прадмесьця**

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Гуцавы мастацкі фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ.**
ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі замежны фільм **ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК.**

Кіно **СПАРТАК** — *23 мая* выдатны фільм **ШЧАСЬЛІВЫЯ КОЛЬЦЫ** камэдыя ў 6 частках.
Штодзенна 4 сэансы:
Пачатак 1—6-30, 2—8 г., 3—9 г. 30, 4—11 г.
КАСА—з 5 г.

АНОНС!
МЁРТВЫЯ ДОМІ
„...Перад Вамі пройдзе адна з самых мрачных эпох рускай гісторыі.
Гэта было царстваваньне Мікалая І..."

Сёньня, 23 мая, у 7 гадз. вечара ў клюбе імя Леніна (вул. Урыцкага) адбудзецца
гарадзкая канфэрэнцыя МепАЗТ
ФРАКЦЫЯ КП(б)Б—у 6 гадзін ў тым-жа клюбе.

БЕЛГАНДАЛЬ прыступіў да разлікаў
АВАНСАВЫХ ТАЛЁНАЎ
ПАД КАМЭРЦЫЙНЫЯ ТАВАРЫ.
Авансы прымаюцца ад індывідуальных асоб і калектыўных залукаў
на **МАНУФАКТУРУ, ГАТОВАЕ АДЗЕНЬНЕ, АБУТАК, ГАЛЁШЫ І ТРЫКАТАЖ.**
Талёны рэалізуюцца ва ўсіх магазынах Белгандалю

СЁНЬНЯ, 23 мая, у 7 гадз. веч.
ЗЬЛЁТ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ
у Доме вучоных,
прысьвечаны канфэрэнцыі па навукова-дасьледчай рабоце ў другой пяцігодцы.

Дрота-цьвікавы і шрубавы завод „Інтэрнацыянал"
ПРЫМАЕ
на працягу II кварталу 1932 г.
ПЕРАПРАЦОЎКУ
давальчаскага дроту—катанкі на **ДРОТ ЦЯНУТЫ, ЦЬВІКІ І ШРУБЫ.**
З прапановамі аб перапрацоўцы зварачацца непасрэдна да заводу па адрасе: г. Рэчыца, завод „Інтэр